КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 34 (257) ◂ 16 верасня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ІНТЭРВ'Ю З ГІ САРМАНАМ

Стар. 11

**ЧЫРВОНЫ КАПТУРОК І СЯМЁРА КАЗЛЯНЯТ**

Той, хто яшчэ ўчора ўспрымаўся як карміцель, мае шанец трансфармавацца ў сваю супрацьлегласць

Стар. 4

**КАЗАК СУПРАЦЬ КАЗАХА**

20 гадоў таму ва Уральску адбыліся сутычкі паміж казахамі і казакамі. Ёсць версія, што ў выпадку з'яўлення ахвяр на захад Казахстана павінны былі быць кінутыя расійскія «міратворчыя войскі»

Стар. 13

**АРТЫМОВІЧЫ**

Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**УЗГАДАЦЬ УСЁ**

Нарыс Алега Новікава з цыклу «Незалежная Беларусь»

▸ З НАГОДЫ

# ПЕРШЫ КАМЕНЬ




Вольга ХВОІН

**Нацбанк абвяргае чарговую дэвальвацыю. Аднак курс рубля пасля першай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы, што прайшла 14 верасня, афіцыйна ўпаў амаль у тры разы ў параўнанні з пачаткам года.**

Паводле вынікаў першай дадатковай гандлёвай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы, курс долара ЗША склаў 8600 рублёў, еўра — 12100, расійскага рубля — 305 беларускіх рублёў. Курс долара на дадатковай сесіі перавысіў курс долара на асноўнай у 1,6 разы. Афіцыйныя курсы, устаноўленыя Нацбанкам на 15 верасня на асноўнай гандлёвай сесіі, склалі: долар ЗША — 5355 рублёў, еўра — 7320, расійскі рубель — 176,36 беларускіх рублёў.

Нацыянальны банк задаволены ходам таргоў на першай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы, але афіцыйна прызнаваць чарговую дэвальвацыю пакуль адмаўляецца. «Мы цяпер не гаворым ні пра якую дэвальвацыю беларускага рубля з той простай прычыны, што няма зыходных пунктаў. Ёсць афіцыйны курс, і наша стратэгічная задача — зрабіць яго адзіным раўнаважным. А на якім узроўні ўдасца гэта ажыццявіць — вось для гэтага мы дадатковую сесію і адкрылі», — заявіў намеснік старшыні Нацыянальнага банка Тарас Надольны. Паводле яго слоў, многія прадаўцы валюты занялі пазіцыю чакання, таму прапанова была невялікай: менш як 5% ад дзённай экспартнай выручкі. Гэта прыкладна 8 мільёнаў долараў. Попыт перавысіў прапанову «ў некалькі разоў».

«Курс знаходзіцца на самай верхняй мяжы (8600 рублёў за долар ЗША) і пры росце прапановы будзе зніжацца», — мяркуе Надольны. Паводле яго слоў, Нацбанк не праводзіў інтэрвенцый, і прагназуецца збліжэнне афіцыйнага курсу з рынкавым на працягу паўтара–двух месяцаў.

Разам з тым чорны рынак адгукнуўся падвышэннем курсу — старыя каціроўкі перайшлі на біржу, а на «чорным рынку» з'явіліся новыя. Напрыклад, еўра прапаноўваюць купіць ад 11200 беларускіх рублёў да 14650 за адзінку, долар — ад 8700 да 10700 рублёў. У абменніках валюта пакуль не з'явілася, і абменнікі плануюць прадаваць яе з абароту, то бок тое, што прынеслі і здалі грамадзяне.

Эксперт Леанід Злотнікаў мяркуе, што рэальны курс рубля цяпер назваць складана. «Рынкавы курс вызначаюць попыт і прапанова. Але на курс уплывае дзяржава праз інтэрвенцыі Нацыянальнага банка. Нацбанк таксама прадае валюту і збівае кошты на яе, збівае рэальны курс», — гаворыць эканаміст. Ён адзначае, што цяпер у краіне склалася ненармальная сітуацыя: ёсць валюта па рыначным курсе, а ёсць па заніжаным курсе Нацбанка, але толькі для асобных катэгорый спажыўцоў.

Дзяржаўная падтрымка валютнага курсу патрабуе істотных сродкаў, чаго цяпер у Беларусі няма. МВФ пакуль адмовіў у выдачы крэдыту на запыт беларускага ўраду. Выканаўчы Савет дырэктараў МВФ заявіў, што магчымасць прадастаўлення Беларусі новага фінансавання залежыць ад узмацнення жорсткасці макраэканамічнай палітыкі ўладаў і іх прыхільнасці структурным рэформам.

«Дырэктары падкрэслілі, што для атрымання фінансавай падтрымкі ад фонду спатрэбіцца прадэманстраваць прыхільнасць моцнай эканамічнай палітыцы і структурным рэформам», — гаворыцца ў распаўсюджаным паведамленні савета. Дырэктары заклікалі ўлады аднавіць знешнюю стабільнасць шляхам далейшага ўзмацнення жорсткасці падаткова-бюджэтнай і грашова-крэдытнай палітыкі.

Міжнародны валютны фонд падтрымлівае «пераход на плаваючы курс рубля, каб усталяваць адзіны абменны курс і забяспечыць магчымасць правядзення неабходнай знешняй карэкціроўкі». Аднак у МВФ таксама канстатуюць, што «Беларусь перажывае эканамічны крызіс», а высілкі, што былі зроблены ўладамі, «былі недастатковымі для аднаўлення даверу рынкаў». Ні Міжнародны валютны фонд, ні беларускія ўлады не могуць даць прагноз адносна зніжэння афіцыйнага курсу рубля, затое прагназуюць далейшую дэвальвацыю нацыянальнай грашовай адзінкі.

Гэта вынікае з заявы намесніка выканаўчага дырэктара МВФ па Беларусі Ёхана Прадэра і дарадчыка выканаўчага дырэктара Вадзіма Місюкаўца: «Ёсць пэўныя цяжкасці, звязаныя з прапановай супрацоўнікаў фонду неадкладна зрабіць абменны курс свабодна плаваючым пры адсутнасці інтэрвенцый з боку цэнтральнага банка, — адзначаецца ў заяве. — Супрацоўнікі фонду прызнаюць, што ўсталяванне свабодна плаваючага курсу будзе прадугледжваць далейшую дэвальвацыю. Заклапочанасць выклікае той факт, што з улікам значнага адкладзенага попыту на замежную валюту ні ўлады, ні супрацоўнікі фонду не ў стане прапанаваць абгрунтаваныя прагноз маштабаў такой дэвальвацыі».

«Відавочна, што ва ўмовах свабодна плаваючага курсу і пры адсутнасці дастатковых рэсурсаў для згладжвання рэзкіх ваганняў рызыка парушэння функцыянавання вытворчасці ў сувязі з фармаваннем інфляцыйна-дэвальвацыйнай спіралі можа апынуцца такой жа, як і спагназаванае супрацоўнікамі фонду парушэнне ва ўмовах дзейнага рэжыму абменнага курсу», — гаворыцца ў дакуменце.

Па курсе 8 600 рублёў за долар сярэдні заробак у Беларусі (1 564 500 рублёў паводле інфармацыі Белстату) за першае паўгоддзе складае каля 180 долараў, сярэдняя пенсія — 70 долараў. Памятаеце, у мінулым годзе некаторыя галасавалі за абяцанне заробку ў 500 долараў?

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПІКЕТЫ НЕ ДАЗВОЛІЛІ

**Апошняя — дзявятая — забарона на правядзенне пікета ў падтрымку Мікіты Ліхавіда прыйшла напярэдадні яго вызвалення.**

Забарону падпісаў намеснік старшыні райвыканкама Уладзімір Навіцкі.

Рух «За свабоду» падрыхтаваў заявы на правядзенне пікетаў, у дзевяці райцэнтрах Мінскай вобласці. І ўсюды атрымаў адмовы.

Таксама прыйшлі адказы, падрыхтаваныя прадстаўніком Руху «За Свабоду» ў Барысаве Сяргеем Салашам і ПЦ «Вясна» Алегам Мацкевічам, з пракуратураў Слуцкага і Крупскага раёнаў.

Слуцкі пракурор Віталь Жукоўскі не ўгледзеў у забароне на правядзенне пікета, падпісанай старшынёй Слуцкага райвыканкама Уладзімірам Даманеўскім, парушэння заканадаўства.

А пракурор Крупскага раёна Аляксей Перасунька без лішніх словаў, фактычна здымаючы з сябе абавязак рэагаваць па сутнасці на парушэнні заканадаўства, «перасунуў» разгляд скаргі Сяргея Салаша на Часнака ў суд Крупскага раёна.

**Паводле Руху «За Свабоду»**

ЗВАНОК

# СТАТКЕВІЧ НЕ ПАДПІША

**Позні́м вечарам 14 верасня Кацярына Статкевіч, дачка экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта Мікалая Статкевіча, даслала ў шэраг незалежных СМІ інфармацыю аб тэлефоннай размове з бацькам, якая доўжылася каля 10 хвілін.**

Гэта было першы раз пасля 19 снежня. «Перыядычна, — паведаміла Кацярына, — бацьку абрывалі на паўслове, на некаторыя пытанні не дазвалялі адказаць наогул. Напрыклад, на пытанне аб здароўі і аб няшчасным выпадку, ён паспеў толькі паведаміць, што рука ў лангеце, як яго перапынілі. Ён сказаў, што застаўся адзін у Шклоўскай калоніі, астатніх ужо выпусцілі, яго ж, хутчэй за ўсё, не выпусцяць яшчэ доўга».

Паводле Кацярыны, прашэнне аб памілаванні Статкевічу прапаноўвалі напісаць шматкроць. «У выніку ён узяў паперу і напісаў даволі рэзкім тонам, што ў злачынцы ён нічога прасіць не будзе, цяпер чакае рэакцыі, — кажа дачка палітвязня. — Бацька сказаў, што «хлопцы падпісалі прашэнне, бо ім пагражалі згвалтаваннем, і папрасіў распаўсюдзіць гэту інфармацыю, гэта важна».

На ўражанне Кацярыны, настрой у бацькі даволі байцоўскі, і ён запэўніў яе, што здавацца не збіраецца, як і падпісваць якія б тое ні было прашэнні.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЗ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

**11 верасня ў мінскім ДК Трактарнага завода прайшла канферэнцыя «Незалежнасць: здабыткі і перспектывы», прысвечаная 20-годдзю нададання Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь статуса канстытуцыйнага закона.**

Мерапрыемства ладзілася ў межах кампаніі «Народная праграма», ініцыяванай Рухам «За Свабоду», пры ўдзеле аргкамітэта па святкаванні 20-годдзя незалежнасці Беларусі.

У канферэнцыі ўзялі ўдзел 260 грамадскіх актывістаў, палітыкаў і экспертаў. Яна складалася з двух секцый. У першай грамадскія і палітычныя дзеячы разважалі пра тое, ці ёсць незалежнасць Беларусі гістарычнай выпадковасцю, што дала яна нашай краіне, што пагражае беларускай незалежнасці і якая будучыня яе чакае.

Сярод выступоўцаў былі колішні спікер Вярхоўнага савета Мечыслаў Грыб, кіраўніца Беларускай асацыяцыі журналістаў Жана Літвіна, метадолаг і палітолаг Уладзімір Мацкевіч, старшыня Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, лідар Партыі БНФ Аляксей Янукевіч.

Другая секцыя ўяўляла сабой дыскусію ў межах кампаніі «Народная праграма», якая складаецца праз экспертныя і грамадскія дыскусіі дзеля ўмацавання незалежнасці Беларусі як пазітыўная канцэпцыі яе развіцця.

На жаль, канферэнцыя была перарваная падчас абмеркавання пенсійнай рэформы — была адключана электрычнасць у зале, дзе яна праводзілася. Рэч у тым, што канферэнцыя была запланаваная да 17-й гадзіны, адпаведна, ад гэтага часу была заключаная арэндная дамова. Адміністрацыя ДК МТЗ папярэдне пагадзілася працягнуць яе яшчэ на гадзіну. Аднак з'явіўся невядомы (не прадставіўся і нічога не тлумачыў), які адключыў электрычнасць у зале.

**Паводле Руху «За Свабоду»**

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# АЎТУХОВІЧ НЕ Ў СПІСЕ

**Вольга ХВОІН**




**Асуджаны ў 2009 годзе ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч ужо адбыў палову тэрміну зняволення. І, паводле заканадаўства, адміністрацыя івацэвіцкай калоніі абавязана падрыхтаваць паперы ў суд, каб пакаранне было зменена на больш мяккае.**

Аднак Мікалай паведаміў свайму прадстаўніку юрысту Алегу Волчаку, што цяпер на яго аказваецца вялікі псіхалагічны ціск, робіцца ўсё, каб было немагчыма прымяніць гэтую праваўую працэдуру.

«Кіраўніцтва калоніі робіць Мікалая Аўтуховіча злосным парушальнікам, — пераказвае юрыст Алег Волчак змест тэлефоннай размовы з Мікалаем Аўтуховічам. — Маўляў, ён парушае рэжым і да ўсяго не падпісаў паперу, што прызнае сваю віну, стаў на шлях выпраўлення. Таксама Мікалаю ўвялі абмежаванне на перадачу прадуктаў. У яго мусіць быць дыетычнае харчаванне, адпаведна, гэтая мера паўплывае на стан здароўя чалавека. Я спытаў, ці напраўду ён парушае рэжым утрымання? «Ды не, — гаворыць, — проста прыдзіраюцца цяпер да кожнай дробязі і афармляюць акты». Мікалай расказаў, што ёсць вялікі псіхалагічны ціск на яго. Не памятаю Аўтуховіча такім засмучаным. Але я нагадаў, што Мікалай у спісе палітвязняў, многія праваабарончыя арганізацыі адсочваюць інфармацыю, што датычная яго. Будзем спадзявацца, што ў кастрычніку ён выйдзе на свабоду».

Цягам апошніх месяцаў на свабоду тройчы адпускалі палітзняволеных, асуджаных за ўдзел у акцыі пратэсту 19 снежня. Ёсць прагнозы, што цяжкія эканамічныя ўмовы прымусяць Аляксандра Лукашэнку вызваліць і астатніх палітвязняў, бо ў такім выпадку можна было б разлічваць на дапамогу з боку ЕС.

Freedom House у 2010 годзе да Сусветнага Дня правоў чалавека абнародавала спіс з 15 найвядомейшых палітычных зняволеных свету. У ім ёсць і прозвішча Аўтуховіча. Упершыню прадпрымальнік і дэмакратычны актывіст, які хацеў стварыць незалежны саюз воінаў-аўганцаў, быў арыштаваны ў кастрычніку 2005 года. Абвінавачаны ў нявыплаце падаткаў, яго асудзілі на тры з паловай гады. Ён быў адным з шасці палітзняволеных, вызваленых у выніку жорсткіх санкцый ЗША і ЕС, аднак ужо ў 2009-м яго зноў асудзілі, гэтым разам на пяць гадоў нібыта за захоўванне зброі патронаў, хаця першапачаткова Аўтуховічу прад'яўлялі абвінавачванне ў змове супраць дзяржслужбоўцаў. Здароўе Аўтуховіча сур'ёзна падарванае серыяй доўгіх галадовак пратэсту і недахопам неабходнай медыцынскай дапамогі.

ГЕНДЭР

# РЭВАЛЮЦЫЯ ДЛЯ ЖАНЧЫН

**Вольга ХВОІН**

**У Аб'яднанай грамадзянскай партыі мяркуюць, што жанчыны маюць права на рэвалюцыю. Таму дзверы партыі для іх адчыненыя. Размова ідзе пра рэалізацыю гендэрнай палітыкі, прасоўванне ў беларускім грамадстве ідэй роўнасці.**

Кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька гаворыць, што ў палітычным жыцці жанчынам пачалі адводзіць самыя непрыемныя працы. «Усе, хто выносіў прысуды на палітычных працэсах, былі жанчынамі. Падчас выбараў асноўную частку выбарчых камісій, якія займаюцца фальсіфікацыямі, складаюць жанчыны», — абураецца палітык.

Але, каб змяніць сітуацыю, паводле яго слоў, жанчыны самі мусяць прыйсці ў публічную палітыку і ўголас заявіць пра сябе. Напрыклад, у час парламенцкіх выбараў. Таксама палітык мяркуе, што прыцягненне да актыўнай дзейнасці жанчын дапаможа змяніць іх электаральныя сімпатыі. «Мы ведаем яшчэ і сацыялогію: значная частка жанчын-выбарцаў галасуе за дзейсную ўладу. Я лічу гэта недарэчнасцю. Гэта ўлада стварае дыскрымінацыйную палітыку ў адносінах да жанчын, а яны за яе галасуюць! Вельмі важна ў гэтай сітуацыі правільна расставіць акцэнты. Думаю, праз выбарчую кампанію мы мусім зламаць гэтыя стэрэатыпы. Жанчыны з іх патэнцыялам мусяць стаць тымі, хто цягне ўвесь чыгуначны састаў! Ну, не фізічна...» — разважае Анатоль Лябедзька.



Кіраўніца грамадскага аб'яднання «Жаночы незалежны дэмакратычны рух» Людміла Пеціна найперш апелюе да эканамічных аспектаў жыцця беларусак. Напрыклад, асноўнай праблемай жанчын з'яўляецца той факт, што іх даходы істотна саступаюць даходам мужчын. «Больш за 60% працуючых жанчын не маюць дастаткова сродкаў на базавыя патрэбы — набыццё ежы і адзення, аплату камунальных паслуг, — дзеліцца Людміла статыстычнай інфармацыяй. — Сярэдні заробак жанчын на 30% ніжэй за заробак мужчын. Гэта прымушае жанчын, якія працуюць у медыцыне, адукацыі, культуры, сацыяльных сферах, працаваць не на адну, а на паўтары-дзве стаўкі. А ёсць яшчэ і хатнія клопаты». Жанчыны не прымаюць удзелу ў выпрацоўцы дзяржаўных рашэнняў — цяпер ва ўрадзе толькі адна жанчына-міністр.

Яшчэ адна праблемная кропка — хатні гвалт у дачыненні да жанчын. Гэтая прыкрая з'ява па-ранейшаму шырока распаўсюджаная, афіцыйная статыстыка МУС Беларусі сведчыць: штогод расце колькасць злачынстваў у сям'і, ахвярамі якіх становяцца жанчыны і дзеці. Таму АГП і грамадскае аб'яднанне «Жаночы незалежны дэмакратычны рух» плануюць падрыхтаваць законапраекты «Аб прадухіленні хатняга гвалту» і «Аб гендэрнай роўнасці».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВЯЛІКІЯ ПРАБЛЕМЫ І МАЛЕНЬКІЯ РАДАСЦІ

Генадзь КЕСНЕР



**Морам слёз, кветак і свечак адзначыліся развітанні з беларускімі спартоўцамі, якія загінулі ў авіякатастрофе на шляху ў Мінск. Тым часам, галовы грамадзян баляць з прычыны штодзённага росту цэн літаральна на ўсё. Кіраўнік дзяржавы злітасціўся яшчэ над 11 асуджанымі за падзеі 19 снежня 2010 года, а апазіцыя атрымала поўху, адкуль не чакала.**

У мінулыя выхадныя Беларусь развіталася з ахвярамі крушэння самалёта ў Яраслаўлі: лепшым хакеістам Беларусі ўсіх часоў 36-гадовы Русланам Салеем, узыходзячай зоркай 21-гадовым Сяргеем Астапчуком, а таксама 31-гадовым трэнерам, былым хакеістам Мікалаем Крываносавым. У суботу на развітанне з Русланам у лядовы палац хакейнага клуба «Юнацтва» ў мінскім Парку Горкага прыйшлі тысячы і тысячы людзей — як заўзятараў хакея, так і проста беларусаў, што пажадалі аддаць апошнюю даніну памяці і павагі легендзе айчыннага спорту. Пахавалі Руслана Салея на Усходніх (Маскоўскіх) могілках сталіцы. На наступны дзень сотні людзей развіталіся з Сяргеем і Мікалаем. Свой апошні прытулак хлопцы знайшлі на Кальварыйскіх могілках.

Нягледзячы на вельмі сумную атмасферу, якая спадарожнічала першай гульні турніру КХЛ мінскага «Дынама» на самай вялікай арэне краіны, нашым хакеістам удалося перамагчы горыч страты сяброў і атрымаць такую важную перамогу над омскім «Авангардам» з лікам 4:1.

**Яйкі пераадолелі псіхалагічны бар'ер у 10 тысяч рублёў за дзясятак, жывы карп каштуе 22–24 тысячы за кіло, амаль столькі ж — замарожаныя бройлеры**

Не далі сябе перамагчы і футбалісты барысаўскага БАТЭ, якія ў Празе стартавалі ў групавым турніры Лігі Чэмпіёнаў супраць каманды «Вікторыя» (Пльзень). Нашы суайчыннікі таксама па ходу гульні прайгравалі 0:1, але наша бразільская зорка з беларускім пашпартам Рэнан Брэсан здолеў зраўняць лік і выратаваць для каманды такі важны бал. Такія маленькія радасці на агульным змрочным фоне.

Чаму змрочным? Зайдзіце ў бліжэйшую краму, і там вы знойдзеце адказ на гэтае пытанне. Кошты на прадукты харчавання прадаўцы перапісваюць амаль кожны дзень, таму ніколі не ведаеш, што зможаш набыць за тую суму, якая ляжыць у тваім кашальку. Надоечы аўтару гэтых радкоў паскардзіўся нават былы кіраўнік Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч: «Толькі што жонка вярнулася з рынку і паведаміла мне, што някепская свініна каштуе ўжо сто тысяч рублёў за кіло, а ялавічына — больш за сто тысяч! Куды мы коцімся?!»

Вось і я задаюся гэтым пытаннем: куды? Калі яйкі ў некаторых крамах пераадолелі псіхалагічны бар'ер у 10 тысяч рублёў за дзясятак, калі жывы карп каштуе 22–24 тысячы за кіло, амаль столькі ж каштуюць і замарожаныя бройлеры, калі экзатычная ўжо чырвоная рыба цягне пад 200 тысяч. Ад 14 верасня зноў выраслі кошты на аўтамабільнае паліва, крыху раней падаражаў праезд у грамадскім транспарце і маршрутных таксі — у апошніх адразу на 500 рублёў, зноў узняліся адпускныя кошты на мяса, цукар зараз «цягне» на тысячу больш (рост 20%), чым гэты прадукт каштаваў яшчэ тыдзень таму. На падыходзе — чарговае павышэнне коштаў на паслугі ЖКГ.

Тым часам, улады, не імкнучыся праводзіць сур'ёзныя эканамічныя рэформы, працягваюць разлічваць на знешнія валютныя паступленні. Расійскі «Сбербанк» гатовы выдаць крэдыт памерам у 1 мільярд долараў акцыянернаму таварыству «Беларуськалій». Як заявіў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Сяргей Румас, пагадненне дасягнута «ў мэтах стабілізацыі на ўнутраным валютным рынку». Гэтым разам заклад акцый «Беларуськалія» ў якасці забеспячэння гарантый вяртання крэдыту не прадугледжаны. Раней агучвалася інфармацыя пра перамовы з мэтай атрымання крэдыту ў 2 мільярды долараў ад расійскага «Сбербанка» і Deutsche Bank пад заклад у 35% акцый. Супраць такога варыянту выступала, у першую чаргу, кіраўніцтва «Беларуськалія».

Пра тое, што дзяржаве, як паветра, патрэбна валюта, кажуць усе эканамісты. Тым больш дзіўнае паведамленне прыйшло 14 верасня з Нацбанку Беларусі. Па словах намесніка старшыні праўлення НБ Тараса Надольнага, Беларусь можа адмовіцца ад новага крэдыту МВФ. Надольны адзначыў, што наша краіна пакуль спраўляецца ўласнымі высілкамі, таму канчатковае рашэнне аб неабходнасці атрымання новага крэдыту МВФ пакуль не прынята. «Паглядзім, як павядзе сябе дадатковая гандлёвая сесія, і тады прымем рашэнне», — сказаў прадстаўнік Нацбанку.

Дзіўнавата, бо яшчэ нядаўна беларускі ўрад вуснамі яго старшыні Міхаіла Мясніковіча заяўляў пра намер атрымаць ад МВФ крэдыт памерам ад 3,5 да 8 мільярдаў долараў. Знайшлася нейкая новая крыніца фінансавання? Хто ж вам адкажа… На паверхні ляжыць хіба што варыянт продажу другой паловы акцый «Белтрансгазу» за 2,5 мільярда долараў, але пра паступленне гэтых грошай можна будзе казаць толькі пасля завяршэння перамоваў па чарговаму кантракту на пастаўкі расійскага газу ў Беларусь на наступны год, бо беларускі бок увязвае пытанне продажу «Белтрансгазу» менавіта з цаной на «блакітнае золата». Шляхі ўрадавыя неспавядальныя…

14 верасня ў другой палове дня стала вядома, што афіцыйны беларускі лідар памілаваў яшчэ 11 удзельнікаў падзей 19 снежня 2010 года. Як пазначана, «карыстаючыся прынцыпамі гуманнасці». Незалежныя эксперты называюць гэты крок кіраўніка дзяржавы не праявай гуманізму, а вынікам патаемнага гандлю ўладаў з Захадам. Што ж, нічога новага тут мы не бачым. Толькі вельмі і вельмі шкада слёз і пакут родзічаў палітычных зняволеных.

Беларуская апазіцыя атрымала нечаканую поўху з боку кіраўніка суседняй краіны — сяброўкі Еўрапейскага Саюза. Так, прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ ў інтэрв'ю літоўскаму радыё выказала меркаванне, што беларускую апазіцыю цікавяць пераважна грошы. «Калі гутарыш альбо чуеш, як размаўляюць некаторыя прадстаўнікі апазіцыі, то часцей за ўсё не чуеш, што іх прыярытэтам і мэтай з'яўляецца незалежная Беларусь… Часцей за ўсё, мы чуем, што трэба больш грошай, і што Расія, у прынцыпе, сябар. Гэта, несумненна, выклікае ў нас пэўную заклапочанасць, паколькі нацыянальны інтарэс Літвы — незалежны сусед, незалежная краіна», — цытуе літоўскага прэзідэнта афіцыйнае БелТА.

У газеце «Lietuvos rytas» яе галоўны рэдактар Рымвідас Валатка так пракаментаваў выказванні Далі Грыбаўскайтэ: «Пасля такіх словаў кіраўніцы дзяржавы адзінае пачуццё, якое цябе ахоплівае, гэта сорам. Сорам за Літоўскую дзяржаву, сорам за "герояў, якія спяць у магілах". Сорам, што Літва абрала прэзідэнтам жанчыну, якой чужое не толькі пачуццё сораму. Прамова па радыё паказвае, што ёй чужое хоць нейкае спачуванне да людзей, з чыіх натуральных правоў і свабодаў ужо паўтара дзесяцігоддзі здзекуецца дзяржаўная машына беларускага дыктатара».

Што тут дадаць?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### РЫГОР ВАСІЛЕВІЧ

Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч хацеў бы да рэгулявання інтэрнэту далучыць ААН. Васілевіч мяркуе, што неабходна падрыхтаваць міжнародную дамову аб упарадкаванні карыстання інтэрнэтам. Дакумент можа быць падрыхтаваны на ўзроўні ААН.

Як адзначыў генпракурор, практыка публікацыі ў інтэрнэце абразлівых артыкулаў, артыкулаў паклёпніцкага характару, падбухторванне да парушэння заканадаўства недапушчальная. «Праблема ёсць, яна патрабуе вырашэння з выкананнем правоў усіх удзельнікаў гэтых адносінаў», — сказаў Васілевіч.

Беларускага дзяржслужбоўца падтрымаў яго калега з Расіі. Генеральны пракурор Расіі Юрый Чайка заявіў, што «кантроль за сацыяльнымі сеткамі павінен быць». «Гэта будзе разумна і ў рамках абароны інтарэсаў грамадзян, і ў рамках недапушчэння росту злачыннасці», — зазначыў ён. Паводле слоў Віктара Чайкі, некантралюемымі гэтыя працэсы быць проста не могуць.

### АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



Беларускі фатограф Андрэй Лянкевіч прадставіць краіну на Photoquai. Запушчаная ў 2007 годзе парыжскім музеем Musee du Quai Branly біенале сучаснага фотамастацтва Photoquai праходзіць у гэтым годзе ў трэці раз. Яе адметная рыса — дэманстрацыя выключна незаходняй фатаграфіі. У экспазіцыі прадстаўлена каля 400 работ 46 фатографаў з 29 краін: ПАР, Конга, Эфіопіі, Нігерыі, Танзаніі, Тога, Марока, Туніса, Бахрэйна, Ірака, Расіі, Кітая, Паўднёвай Карэі, Індыі, Японіі, Тайваня, Кубы, Камбоджы, Лаоса, Малайзіі, Інданезіі, Сінгапура, Тайланда, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Чылі, Калумбіі, Бразіліі. Беларусь прадставіць выстава Андрэя Лянкевіча «Фальшывыя жывёлы».

«Прынцыповым момантам фотабіенале з'яўляецца аддзяленне еўрапейскай і амерыканскай фатаграфіі, — патлумачыла мастацкі дырэктар Photoquai, фатограф і рэжысёр Францыаза Юг'е. — Такім чынам, у прадстаўленым адборы мы бачым імёны з Беларусі і Расіі, бо гэтыя краіны не частка еўрапейскай супольнасці, у той час як дзяржавы Балтыі ў яе склад уваходзяць — таму іх аўтараў у экспазіцыі няма. Безумоўна, мы б хацелі ўбачыць фатографаў з Украіны і Казахстана, аднак у працэсе падрыхтоўкі атрымалі менавіта тыя імёны і працы, якія і будуць прадстаўленыя».

Самымі цікавымі, па словах Францыазы Юг'е, з'яўляюцца экспазіцыі фатографаў з Расіі, Кубы і краін Паўднёва-Усходняй Азіі. «Куратары, якіх я прызначыла для выбару аўтараў, — працягвае яна, — валодаюць глыбокімі ведамі ў галіне сусветнай фатаграфіі, яны мелі зносіны з галерыстамі, дырэктарамі музеяў. Прадстаўленыя фатографы вядомыя ў сваіх краінах, але не ў Еўропе, і ў Францыі ў прыватнасці. У той жа час асноўнай умовай пры адборы было тое, каб аўтары раней не выстаўляліся ў Францыі».

«Photoquai 2011 — гэта падарожжа праз лямантуючы свет, спрацыраваць уяўленнем фатографаў, якія паказваюць сучасны стан іх таварыстваў і культур, выдатных ад нашай. Для нас яны як ахоўнікі, якія не даюць нам заснуць», — кажа Францыаза Юг'е.

Выстава пройдзе з 22 верасня па 4 снежня 2011 года.



### АЛІМ СЕЛІМАЎ

У турэцкім Стамбуле ў фінальным паядынку вагавай катэгорыі да 84 кілаграмаў прадстаўнік Беларусі Алім Селімаў перамог паляка Даміяна Янікоўскага і стаў двухразовым чэмпіёнам свету па грэка-рымскай барацьбе. На шляху да вырашальнага бою Алім Селімаў паслядоўна выйграў у Таічы Оку (Японія), Янарбека Кенджэева (Кыргызстан), Самана Тахмасебі (Азербайджан) і Рамі Хінценіемі (Фінляндыя).

Акрамя золата сусветнага першынства беларускі барэц стаў уладальнікам алімпійскай ліцэнзіі ў Лондан–2012. Напярэдадні беларускі спартсмен Элбек Тажыеў (55 кілаграмаў) заваяваў сярэбраны медаль, а Цімафей Дзейнічэнка (96 кілаграмаў) заняў 5-е месца. Яны таксама сталі ўладальнікамі ліцэнзій на Алімпіяду–2012. Пуцёўкі ў алімпійскі Лондан атрымаюць па шэсць лепшых барцоў у кожнай вагавай катэгорыі.

Алім Селімаў родам з Сулейман-Стальскага раёна, па нацыянальнасці лезгін. У 1998 годзе ён прыехаў у Мазыр да сяброў пагасцяваць. Сустрэўся з трэнерам па грэка-рымскай барацьбе Малікам Эскэндэравым, таксама выхадцам Дагестана, які высока ацаніў патэнцыял спартоўца (да гэтага Алім займаўся вольнай барацьбой) і прапанаваў юнаку застацца. Спачатку ён трэніраваўся ў Мазыры, потым пераехаў у Гомель. У 2005 годзе Алім Селімаў у складзе зборнай Беларусі заваяваў свой першы тытул чэмпіёна свету па грэка-рымскай барацьбе.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЧЫРВОНЫ КАПТУРОК І СЯМЁРА КАЗЛЯНЯТ

Сяргей НІКАЛЮК




**Калі ў 1994 годзе грамадства апынулася ў дыскамфортным стане пад уздзеяннем ліберальных рэформаў, то сёння — па прычыне банкруцтва «моцнай дзяржавы».**

Казку пра Чырвоны Каптурок завяршае happy end. Вось яе фінал: «Але, на шчасце, тым часам праходзілі каля хаткі дрывасекі з сякерамі на плячах. Пачулі яны шум, забеглі ў хатку і забілі Ваўка. А потым распаролі яму пуза, і адтуль выйшла Чырвоны Каптурок, а за ёй і бабуля — абедзве жывыя і цэлыя». Да свайго сямейнага шчасця Каза і яе сямёра казлянят таксама прыйшлі праз смерць Ваўка: «Пачалі яны скакаць. Каза пераскочыла, а Воўк скокнуў ды і ўваліўся ў гарачую яму. Пуза ў яго ад агню лопнула, казляняты выскачылі адтуль, усе жывыя, ды скок да маці! І сталі яны жыцьпажываць, як і раней».

У першай казкі ёсць аўтар — француз Шарль Перо, другая казка — руская народная. Што іх аб'ядноўвае? Уяўленне пра тое, што шлях да шчасця ляжыць праз смерць ворага. З Царэўнай-жабай у свой час аналагічная гісторыя здарылася. Яе доўгаму і шчаслівому жыццю з Іванам-царэвічам папярэднічала чарада забойстваў: зайца, качкі і Кашчэя. Вывернуты з коранем дуб не лічым.

## Атака на прынадны кавалак

Перо жыў у другой палове XVII стагоддзя. Няма нічога дзіўнага ў тым, што і сам казачнік успрымаў жыццё як арэну, на якой у смяротнай сутычцы сышліся Дабро і Зло. Для шматлікіх беларусаў такое ўспрыманне жыцця актуальна і дагэтуль (гл. «Рэспубліка талерантных маніхеяў»). Яны перакананыя, што носьбітамі зла з'яўляюцца пэўныя людзі, знішчэнне якіх аўтаматычна адкрые дарогу ў царства Дабра і Праўды.

Маніхей, калі сутыкаецца з праблемай, не абцяжарвае сябе аналізам. Ён накіроўвае сваю энергію на пошук ворагаў. Праілюструю сказанае цытатай улюбёнага аўтара: *«И причины периода, который мы переживаем очередной раз, не только внутри нашей страны. Ещё больше причин извне!* <…> *Я, конечно, понимаю, я не мечтатель, что никто никогда не позволит государству в центре Европы ходить в «белых перчатках» и радоваться жизни. Конечно, будут атаковать и слева, и справа — уж слишком лакомый кусок и в материальном, и в геостратегическом отношении наша страна».*

Зірнём на *«лакомый кусок»* з пункту гледжання афіцыйнай статыстыкі. Сярэдняя зарплата ў чэрвені склала 1 782,9 тысячы рублёў ці 350 долараў па курсу Нацбанка, што ніякага дачынення да рэальнасці не мае. Пагадзіцеся, *«ходить в «белых перчатках» и радоваться жизни»* з такім непад'ёмным цяжарам у гаманцы адважыцца далёка не кожны. Але, магчыма, гэты сумны вынік 17-гадовага блукання *«своим путем»* сфармаваўся не пад уздзеяннем бесперапынных атак злева і справа?

У чарговы раз працытую невядомага аўтара: «Мова дадзена ўладзе для самавыкрыцця». Гэтаму віду дзейнасці беларуская ўлада рэгулярна аддаецца, разважаючы, у прыватнасці, на ўпадабаную тэму пра *«равнодоходность»*. Цэны, маўляў, на газ у Беларусі значна вышэй, чым у Расіі, адсюль і эканамічныя праблемы, у тым ліку і з ростам дабрабыту.

Але калі адсутнасць цэнавай *«равнодоходности»* робіць беларускую прамысловасць неканкурэнтаздольнай на Усходзе, то чаму б тады нам ні заваліць сваімі таннымі таварамі Захад, які атрымлівае расійскі газ па больш высокіх цэнах? Аднак такім чынам ставіць пытанне ў нас не прынята, і часам здараюцца праколы. Даю слова яшчэ аднаму выдатнаму аўтару, акадэміку і палітыку Анатолю Рубінаву: «Савецкі Саюз, безумоўна, адставаў па тэхналагічным узроўні ад Еўропы. І сёння ўзровень тэхналогій як у Беларусі, так і ў Расіі застаецца істотна ніжэйшы (вылучана намі — С.Н.), чым у Цэнтральнай Еўропе. Таму еўрапейскія цэны на энерганосьбіты для нас пакуль непад'ёмныя».

Высвятляецца, што справа не ва ўдарах, а ў істотна ніжэйшым тэхналагічным узроўні айчыннай прамысловасці. Але дзе і калі ўлада вяла сур'ёзную размову з грамадствам з нагоды яго павышэння?

## Не спяшайцеся цiснуць на клямку

Для такой размовы патрэбныя, прынамсі, двое. Такі мінімум у рэспубліцы ёсць. Я маю на ўвазе ўладу і грамадства. Няма, на першы погляд, і недахопу ў размовах, але вядуцца яны не паміж уладай і грамадствам, а ўладай з грамадствам, прычым выключна ў рэжыме маналогу.

Дыялог як спосаб узгаднення пазіцый бакоў, як спосаб пошуку залатой сярэдзіны з'яўляецца гістарычнай катэгорыяй. Традыцыйнаму грамадству для рашэння бягучых праблем (іншых праблем яно і не ведала) цалкам хапала маналогу. Гэта быў аўтарскі маналог першай асобы, ці, як гэта ні падасца дзіўным, маналог веча. Уся справа ў тым, што веча не прадугледжвала правa меншасці на ўласнае меркаванне, і калі падчас усенародных абмеркаванняў адбываліся спрэчкі, то заўсёды ў выглядзе маналогаў, якія канфліктавалі паміж сабой і часта завяршаліся пабоішчамі.

Тое, як у рэжыме маналогу працуе сучасны аналаг веча — Усебеларускія народныя сходы, — мы назіралі ўжо чатыры разы. Не выключана, што хутка з'явіцца магчымасць бачыць яшчэ адно ўсебеларускае мерапрыемства, але гэтым разам у выглядзе з'езду патрыятычных сіл.

Маналог — гэта форма выражэння маніхейскай свядомасці. Засваенне маналогу, далучэнне да маналогу маніхей разглядае як засваенне і далучэнне да Праўды, якая супрацьстаіць д'ябальшчыне плюралізму. Зразумела, што Праўда з вялікай літары можа быць толькі ў адзіночным ліку, і яна вартая таго, каб быць зацверджанай любымі сродкамі, аж да фізічнага знішчэння яе апанентаў.

Адрозніць сапраўднага носьбіта Праўды ад пярэварацня часам не так проста. Вернемся да нашага казачнага ваўка. І ў першым, і ў другім выпадку ён змушаны выдаткаваць масу высілкаў, каб даверлівая Чырвоны Каптурок і казляняты, што страцілі грамадзянскую пільнасць, не змаглі распазнаць у ім пярэваратня.

Прывяду толькі адзін з фрагментаў казкі Перо:

«— Хто там? — спытаў Воўк.

Але голас у Воўка быў грубы, і Чырвоны Каптурок, пачуўшы яго, спачатку спалохалася. Але потым падумала, што бабуля, напэўна, прастуджаная, і адказала:

— Гэта я, ваша ўнучка, Чырвоны Каптурок. Я прынесла вам прснакоў і гарнушак масла ад матухны!

Тады Воўк крыкнуў трошкі танчэйшым голасам:

— Цісні на клямку, слясак адскочыць.

Чырвоны Каптурок націснула на клямку, і дзверы адчыніліся».

Так і хочацца ўсклікнуць: людзі, будзьце пільныя, не цісніце на клямку ў надзеі, што за дзвярамі вас чакаюць нізкія кошты і высокія зарплаты, якія так шчодра абяцаюць пярэваратні з «пятай калоны». Адно абнадзейвае, што я не самотны ў сваім імкненні папярэдзіць даверлівых і згубіўшых грамадзянскую пільнасць беларусаў. Цытую па тэксце Пaслання–2010: *«И самое страшное — когда мы успокоены. Самоуспокоены. Всё хорошо, всё и дальше будет хорошо. Будьте бдительны, всё не так просто. Политическая борьба — это самая тяжелая, порой грязная и неблагодарная, непредсказуемая работа. Поэтому смотрите, чтобы через растопыренные пальцы не утекло всё то, что мы с вами сделали за последние годы».*

## Час пераварочваць манетку

Усім нам неаднаразова і даходліва тлумачылі, што ў Беларусі *«лимит революций и потрясений исчерпан еще в прошлом столетии»*. Відавочна, літаральна на пальцах паказвалі, чаму *«опять наступать на одни и те же грабли наш народ не намерен»*. Для тых, хто ў свой час няўважліва сачыў за рухам пальцаў уладальніка «царскіх паўнамоцтваў», нагадаю: *«Вирус «цветных революций» поражает только слабые страны, чей государственный организм измотан экономическими и социальными проблемами, а власть находится в конфронтации с населением. В Беларуси для него просто нет питательной среды».*

Пад носьбітамі рэвалюцыйнага светапогляду ў нас звычайна маюць на ўвазе прадстаўнікоў «пятай калоны», але давайце глянем на праблему не з вышыні ўладнай «вертыкалі», а з пагорка азбукавых паліталагічных ісцін. Для гэтага нам спатрэбяцца чатыры радкі з «Інтэрнацыяналу»:

*Весь мир насилья мы разрушим*
*До основанья, а затем*
*Мы наш, мы новый мир*
*построим, —*
*Кто был ничем, тот станет всем.*

Перад намі тыповы ўзор маніхейскага ўяўлення пра тое, што разбурэнне старога тоеснае акту фармавання новага. Важна падкрэсліць, што новае не вырастае са старога, а ўяўляе нешта цалкам яму процілеглае, яно як бы з'яўляецца з нічога. Аналагічны працэс адбываецца і на ўзроўні асобы. Яшчэ сёння раніцай яна была *«ничем»*, а ўжо да абеду раптам становіцца *«всем»*.

Рэвалюцыя ва ўяўленні маніхеяў — гэта змена ў інверсійным рэжыме (больш падрабязна пра гэта чытайце ў «Дыфузнай незадаволенасці»). Кожны з нас лёгка здольны прарабіць яе ў паменшаным маштабе ў сябе на далоні. Для гэтага дастаткова пакласці на далонь манетку, а потым хутка перавярнуць яе (слова «інверсія» паходзіць ад лацінскага «inversio» — пераварочванне). Вось, уласна, і ўсё. Зло грамадства ўвасобленае ў пэўных людзях. Такім чынам, для наступлення ўсеагульнага шчасця неабходна знішчыць гэтых пэўных людзей, г. зн. ваўку неабходна распароць пуза.

І вось тут я пераходжу да асноўнай думкі: носьбітамі маніхейскай (інверсійнай) свядомасці ў Беларусі пераважна з'яўляюцца прадстаўнікі большасці, той самай большасці, на якую 17 гадоў абапіраўся наш «адзіны палітык». Гэта яны ў 1994 годзе сталі асноўнай рухальнай сілай «электаральнай рэвалюцыі». Рэвалюцыю яны правялі ў інверсійным рэжыме, з мэтай пазбаўлення ад дыскамфортнага стану, у які апынуліся ў выніку ліберальных рэформаў Гарбачова.

Сёння большасць зноў знаходзіцца ў дыскамфортным стане, але не пад уздзеяннем ліберальных рэформаў, а па прычыне банкруцтва «моцнай дзяржавы», яна губляе свой патэрналісцкі рэсурс літаральна на вачах. І таму той, хто яшчэ ўчора ўспрымаўся як карміцель, мае шанец трансфармавацца ў сваю супрацьлегласць. Паміж абсалютным Дабром і абсалютным Злом у галовах маніхеяў няма нічога прамежкавага. Яны здольныя змяняць свае погляды выключна ў інверсійным рэжыме. *«Кто был ничем, тот станет всем»*. Сапраўдная і зваротная высНова: *«Кто был всем, станет ничем»*. Інакш інверсійная логіка не працуе.

Звярніце ўвагу: у 1994 годзе пад уздзеяннем інверсіі большасць распарола пуза гіене лібералізму. Сёння справа ідзе да таго, што яго ахвярай стане воўк аўтарытарызму, г. зн. інверсія памяняла знак. Таму калі ў першым выпадку інверсія ўзмацніла раскол паміж большасцю і меншасцю, то ў другім яго знівелюе.

Айчынныя рэвалюцыі не варта блытаць з рэвалюцыямі на Захадзе, якія перадалі ўладу ў рукі трэцяга саслоўя. Да нас іх досвед дачынення не мае.

ЖЫЦЦЁ

# ЯК СТАЦЬ ЗОРКАЙ У ПРАВІНЦЫІ

Таццяна ШАПУЦЬКА

**Героі нашай гутаркі выбітныя сваёй мястачковасцю, сваёй адданай працай «на месцы». Незалежны журналіст з Глыбокага Кастусь Шыталь і палітык, экс-дэпутат з Мастоў Зміцер Кухлей на ўласных прыкладах даказваюць, што эфектыўна можна працаваць і ў сябе на малой радзіме.**

## Гісторыя першая

Карэспандэнту вядомага рэгіянальнага сайта навінаў «Westki.info» Кастусю Шыталю ўсяго 21 год, але ягонае імя наводзіць страх на ўсё мясцовае чыноўніцтва. «Я ж заўжды маю фотаапарат у руках», — усміхаючыся, тлумачыць хлопец. І ўзгадвае, як пасля апублікаванага ў інтэрнэце здымка пустых паліц мясцовай мэблевай крамы старшыня Глыбоцкага райвыканкама Алег Морхат у шаленстве лётаў па крамах і патрабаваў хоць чым запоўніць паліцы.



Кастусь Шыталь

Нягледзячы на тое, што апошнія гады юнак займаецца выключна журналістыкай, а не палітыкай, таўро «галоўнага апазіцыянера Глыбоччыны» трывала замацавалася за ім яшчэ са школьнага ўзросту. Кастусь распавядае, як, даведаўшыся прозвішча вядоўцы Шыталя, дырэктарка бібліятэкі суседняга раёна адмовіла ў правядзенні яго краязнаўчай лекцыі для шкаляроў.

«Бацькі шмат каго з сяброў, знаёмых забаранялі ім запрашаць мяне дадому. Рознага хапала», — гаворыць Кастусь. Ды і зараз хапае. Дастаткова прыгадаць, як у жніўні гэтага года пасля двайнога «абстрэлу» чорнай фарбай будынка Глыбоцкага райвыканкама Кастуся затрымалі, калі ён сфатаграфаваў будынак, прымусілі даць тлумачэнні, знялі адбіткі пальцаў. Юнака наўпрост дагналі на машыне ў цэнтры Глыбокага, калі ён ехаў на ровары, і адвезлі ў РАУС на размову наконт гэтага здарэння.

Тым не менш, журналіст упэўнены, што праца ў сваім родным кутку не менш цікавая і карысная за дзейнасць у сталіцы: «Так, у Мінску я адчуваў бы сябе камфортней. У Мінску шмат аднадумцаў, там можна кантактаваць толькі са сваімі, круціцца ў дэмакратычным асяродку. У Глыбокім, дзе жыве ўсяго 20 тысяч чалавек, так не атрымаецца. Затое ты бліжэй да звычайных людзей. У Глыбокім і Докшыцах (суседні раён) усе ведаюць, хто такі Кастусь Шыталь. Ды і ёсць жа любоў да свайго мястэчка», — даводзіць юнак.

Кастусь не хавае, што публічнасць і актыўнасць зачыніла яму дзверы ў кабінеты чыноўнікаў, што ўскладняе журналісцкую працу, але затое ўзмацніла давер мясцовых жыхароў да яго. Праўда, і тут здараюцца казусы: напрыклад, перад снежаньскімі выбарамі пільныя жыхары вёскі Гліннае Докшыцкага раёна здалі яго ўчастковаму, калі журналіст фатаграфаваў, як яны добраўпарадкуюць тэрыторыю: «На машыне самі з'ездзілі за міліцыянтам на ўсялякі выпадак — маўляў, трэба разабрацца, чаго ён тут за месяц за прэзідэнцкіх выбараў фатаграфуе».

Кастусь запэўнівае, што ні чалавечай, ні прафесійнай зайздрасці да Мінска і мінчукоў ён не мае: «І ў нас хапае падзеяў. Побач у Шаркоўшчыне распачалася выстава карцін з мастацкага пленэра, прысвечанага Эміліі Плятэр. У тую сераду была «маўклівая акцыя». На выхадных у Глыбокім адбыўся VII Фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграм «Magnificat–2011».

Куды ж зайздросціць! Тут і карэнны мінчанін можа займець комплекс непаўнавартасці.

## Гісторыя другая

Зміцер Кухлей — зорка палітычнага жыцця 16-тысячнага горада Масты. Абраны ў 2007 годзе дэпутатам Мастоўскага раённага савета (адзіны прадстаўнік дэмакратаў у мясцовых саветах па Гродзенскай вобласці), на мясцовых выбарах у 2010 годзе пацярпеў паразу — перамога ў асноўны дзень галасавання не кампенсавала скрадзеных падчас датэрміновага галасавання галасоў.



Зміцер Кухлей

Зараз Зміцер займаецца «Беларускай хрысціянскай дэмакратыяй», але дэпутацкай справы не кідае — дапамагае сваім выбарцам вырашаць самыя разнастайныя праблемы. «Народны дэпутат» Кухлей толькі за апошні год дамогся правядзення капітальнага рамонту ў адным з шматкватэрных дамоў, асвятлення вуліц у новым мікрараёне, ліквідацыі прычын сталага затаплення падвалаў іншага буйнога дома. «Бачыце, грамадскай працы хапае і ў Мастах, проста мы ставім акцэнт на іншых накірунках — напрыклад, вырашэнне камунальных праблемаў. Калі ж у Мінску адбываюцца масавыя акцыі пратэсту, мы прыязджаем туды», — тлумачыць спецыфіку дзейнасці «на месцы» Зміцер Кухлей.

Маючы досвед дзяржаўнай працы, Зміцер захаваў даволі добрыя стасункі з мясцовымі чыноўнікамі: «Неафіцыйна я магу цудоўна з імі кантактаваць, але калі ім спускаюць загад зверху… Нядаўна мяне жыхары дамоў абралі старшынёй 3-х кааператываў, але гэтае рашэнне мусіць зацвярджаць старшыня выканкама. Не зацвердзіў…»

Як палітыку, Змітру Кухлею важна мець моцную каманду аднадумцаў: «Мы з паплечнікамі наладжваем асабістыя кантакты з людзьмі, ангажуем іх у грамадскую працу. Нехта прыходзіць праз улёткі, нехта далучаўся на «маўклівых акцыях», калі яны праходзілі. Галоўная праблема ў тым, што актыўныя людзі з'язджаюць з Мастоў. І не таму, што тут на іх моцна ціснуць, а па банальнай прычыне — беспрацоўе! Няма звычайнай працы, каб зарабляць на жыццё». Сябе асабіста ў сталіцы Зміцер Кухлей не бачыць, гаворыць, што згубіўся б там сярод іншых, а тут яго людзі цэняць, нават пазнаюць на вуліцах.

* * *

Прыкра, што такія аддадзеныя свайму мястэчку і яго жыхарам людзі, як Кастусь Шыталь і Зміцер Кухлей, хутчэй выключэнне, чым заканамернасць. Так апынулася, што тыя, з кім я хацела таксама пагутарыць для гэтага артыкула, пераехалі будаваць кар'еру ў Мінск ці з'ехалі на заробкі за мяжу. Нельга сказаць, што іх пераезд быў пытаннем жыцця і смерці, аднак для іх родных гарадкоў і мястэчак гэта непапраўная страта.

Некалі журналісты спыталіся славутага амерыканскага беларуса Вітаўта Кіпеля, што ён думае пра тых, хто з'язджае за мяжу. Ён адказаў так: «Нам пагражаў расстрэл. З'ехаць — было адзінай формаю выжыць». Сёння ж застацца — гэта адзіная форма барацьбы за беларускасць. А што пагражае тым людзям, якія масава бягуць з правінцыі ў Мінск?

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ЗБЯДНЕЛЫЯ ЖАБРАКІ

**Кожная армія ў мірны час рыхтуецца да вайны. І кожная армія ўступае ў вайну непадрыхтаванай.**



Нешта падобнае адбываецца ў эканоміцы: плённа працуючы над павышэннем уласнага дабрабыту і спрыяючы росквіту краіны, людзі аднойчы губляюць амаль усё, зароблене «непасільным трудом».

Толькі пачынаюць годна жыць, як грошы заканчваюцца.

Пра падабенства ваенных і эканамічных катаклізмаў разважалі многія адукаваныя людзі, а нямецкі генерал Клаўзевіц нават адзначыў, што вайна ёсць формай ажыццяўлення палітыкі, якая, у сваю чаргу, сама ёсць канцэнтраваным вынікам эканомікі. Між іншым, з гэтага вынікае, што наступствы эканамічных правалаў могуць быць не меншыя, чым страты ад ваенных дзеянняў. Прыкладам, колішні брытанскі прэм'ер Лойд Джордж лічыў, што адным з вельмі непрыемных наступстваў Першай сусветнай вайны стаў фактычны параліч сусветнай гаспадаркі. Нават далёкія ад тэатра ваенных дзеянняў краіны панеслі значныя эканамічныя страты, паколькі амаль усе традыцыйныя партнёры страцілі магчымасць выконваць узаемныя фінансавыя абавязацельствы.

Даводзілася выкручвацца, ладзіць нешта часовае з "падручных матэрыялаў", рызыкуючы разагнаць інфляцыю да хуткасці, што пагражала ўсёй фінансавай сістэме ўласнай краіны. Вайна да грошай вельмі ахвочая, а сама зарабляць не ўмее. І таму ўрад звычайна робіць тое, што лепш за ўсё ўмее. Друкуе грошы. І вось у выніку трох гадоў вайны расійскі рубель стаў удвая больш танным. Цэны, адпаведна, падскочылі, працоўныя вышлі на вуліцы, а экстрэмісты з гэтай нагоды зрабілі рэвалюцыю.

Што далей было, многія яшчэ ведаюць з уласнага досведу. Калі напрыканцы савецкай гісторыі ўрад пачаў друкаваць грошы на патрэбы перабудовы, усё амаль адразу і скончылася. Грошай стала многа, тавары зніклі.

Той жа Клаўзевіц бачыў мэту вайны ў тым, каб змусіць непрыяцеля выконваць свае ўмовы. Па магчымасці, ашчаднымі сродкамі. Але калі не ўдаецца, то ўсё можа пайсці ў ход… Амаральная, карацей, справа. Як і палітыка? А чаму ж не! На тое і існуе ўрад, каб змусіць падданых выконваць сваю волю. Звычайна ідэолагі гэты факт хаваюць пад рознымі патрыятычнымі развагамі. Але, мусіць, нават сляпы ўбачыць, што за імі стаіць жаданне правіцеля захаваць сваю ўладу. Прыкладам, апошнія гады ў Беларусі больш за ўсё разважалі пра сацыяльна-эканамічную стабільнасць, пра ўстойлівае развіццё, што былі дасягнутыя дзякуючы выключна намаганням правіцеля. Пры гэтым хібы аргументацыі паспрабавалі пераадолець такім універсальным аргументам, як грошы. Склалі адпаведны графік і пачалі раздаваць. Каму болей, каму меней, але ўсім, за малым выключэннем.

Разлік быў такі — пасля чарговай перамогі на выбарах, дзесьці трохі пазычыць, магчыма, нешта прадаць, потым нейкім чынам крыху абжуліць даверлівы электарат. Карацей, аднавіць раўнавагу паміж нацыянальнай валюта і замежнымі, паміж коштамі рознічнага гандлю і грашыма насельніцтва. Разлічвалі на дробную аперацыю з дастатковым тактычным поспехам, а давялося ўвязацца ў зацяжныя баі з насельніцтвам і страціць стратэгічную ініцыятыву. Разлічвалі праз дэвальвацыю прыхаваць немагчымасць заплаціць па сваіх жа вэксалях, а атрымалі імклівы рост коштаў і на спажывецкія тавары, і на паслугі, і на фактары вытворчасці. І пры поўнай адсутнасці нейкіх прыкмет будучай стабілізацыі.

Усе стогнуць, усе прагнуць, усе баяцца. Адны, у каго ёсць долары, што пасля абвяшчэння стабілізацыі ён страціць набытую ў фактычным падполлі вартасць, іншыя — наадварот, што долар набярэ большую, яшчэ большую вагу. І канчаткова паставіць на калені мясцовую прамысловасць, якая за сыравіну, энерганосьбіты ды іншае дабро павінна плаціць «по реальному курсу», а зарабляць на гэта грошы на ўшчэнт збяднелым унутраным рынку.

Дарэчы, войны прыводзяць да збяднення не толькі (і не заўжды) пацярпеўшых паразу, але нават і пераможцаў.

Эканамічныя войны — не выключэнне. І таму можна, перақазаўшы Міхаіла Жванецкага, лічыць, што ў Беларусі ў выніку антынароднай палітыкі ўрада з'явіліся першыя ў свеце збяднелыя жабракі. Сёння заяўлена, што рынкавы курс долара (па якому, магчыма, яго можна будзе набыць у абменніках), склаўся на ўзроўні 8600 рублёў. А гэта значыць, што кіраўніцтва Беларусі за 4 месяцы «ўпалавініла» даходы яе грамадзян.

Як мы памятаем, некалі гэта прывяло да грамадзянскай вайны. У нас жа пакуль толькі да правалу сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Цікава, што шматлікія прапагандысты быццам бы не заўважаюць гэтага ды адно цвердзяць — такая спецыяльная (для народа) палітыка будзе бясконца доўжыцца. Не раўнуючы, як тое будаўніцтва светлай будучыні.

Як заўважыла адна цнатлівая дзяўчына, не магу есці такую кілбасу, што сама ў роце расце.

Можа, і нам хопіць?..

МЕРКАВАННЕ

# ІНФЛЯЦЫЯ І Ў АДУКАЦЫІ

Вольга ХВОІН

**З 1 верасня адукацыйныя ўстановы Беларусі пачалі працаваць паводле Кодэкса аб адукацыі. Важкі талмуд рэгулюе адносіны паміж суб'ектамі адукацыйнага працэсу і сам працэс. Цяпер заканадаўча прапісаныя пакаранні навучэнцам, напрыклад, за спазненні ці паленне на тэрыторыі адукацыйнай установы. Але разам з тым спецыялісты адзначаюць, што на карэнныя змены, рэформу сістэмы адукацыі ўвядзенне кодэкса ніякім чынам не ўплывае.**



Святлана Мацкевіч і Уладзімір Дунаеў

## За спазненне адкажуць

Увядзенне Кодэкса аб адукацыі пакуль не выклікала неабходнасці карэктаваць навучальныя планы. На працягу года Міністэрства адукацыі будзе маніторыць працу навучальных устаноў, і ў наступным годзе вызначыцца з асобнымі напрамкамі дзейнасці сістэмы адукацыі.

У кодэксе цяпер заканадаўча замацаваны шэраг навінак. Так, Кодэкс аб адукацыі ўводзіць у Беларусі новыя формы навучання (напрыклад, дыстанцыйнае навучанне для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця), дае правы ствараць ва ўстановах адукацыі класы ці групы з навучаннем на замежнай мове.

Цяпер усе студэнты ВНУ, навучэнцы ССНУ і ПТВ пачнуць падпісваць дамову на навучанне, дзе будуць прапісаныя правы, абавязкі і адказнасць студэнта і ВНУ, а пры неабходнасці — працадаўцы. Кодэкс аб адукацыі ўводзіць дыплом даследчыка, які будзе выдавацца выпускнікам аспірантуры, што паспяхова прайшлі навучанне, але па нейкіх прычынах не змаглі абараніць кандыдацкую дысертацыю.

Кодэкс таксама прадугледжвае новыя нормы дысцыплінарнай адказнасці навучэнцаў. У прыватнасці, уводзіцца паняцце «дысцыплінарная правіннасць навучэнца». Падставай для прыцягнення навучэнца да адказнасці можа стаць, да прыкладу, спазненне або няяўка без уважлівых прычын на занятак, парушэнне дысцыпліны ў часе адукацыйнага працэсу, невыкананне без уважлівых прычын законнага патрабавання педагагічнага работніка, абразы ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, распаўсюд інфармацыі, якая наносіць шкоду здароўю навучэнцаў ды іншае.

Каментуючы новы кодэкс, старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч зазначыў, што цяпер вучня могуць выключыць са школы за тры выніковыя нулявыя адзнакі. Або калі ён прапускаў заняткі без уважлівай прычыны 30 ці больш дзён цягам навучальнага года.



Аляксандр Вараненка

Гэта тычыцца толькі вучняў 10-х і 11-х класаў. Але адлічэнне не будзе адбывацца без узгаднення з бацькоўскім камітэтам, саветам школы і камісіяй па справах непаўналетніх. Дзеці, адлічаныя са школы, будуць накіраваны на курсы для набыцця прафесіі.

## Усе пры справе

Прадстаўнікі акадэмічнай супольнасці з адукацыйным кодэксам ніякіх спадзяванняў на рэформы не звязваюць. Маўляў, гэта толькі ўзмацніла адміністрацыйную сістэму, і не больш. «Увядзенне кодэкса — манеўр, што толькі адцягвае ўвагу. І робіцца гэта ва ўмовах, калі абсалютна няма ідэй, новага бачання, што рабіць з адукацыяй. Гэта традыцыйна беларускі падыход, — гаворыць кандыдат педагагічных навук, эксперт Агенцтва гуманітарных тэхналогій Святлана Мацкевіч. — Ёсць вельмі многа заканадаўчых актаў, датычных адукацыі. Іх усе аб'ядналі, больш падрабязна прапісалі ў кодэксе розныя акалічнасці. Цяпер усе мусяць працаваць паводле гэтага кодэкса, прыводзіць сваю дзейнасць у адпаведнасць з кодэксам. То бок усе занятыя справай, але рэформа не адбываецца, толькі мітусня! Законы ў гуманітарных сістэмах трэба пісаць тады, калі яны спачатку апрабаваныя метадам спробаў і памылак».

Сістэму беларускай адукацыі рэфармуюць рэгулярна. Але задаволенасці ні ў навучэнцаў, ні ў выкладчыкаў гэта не выклікае. Сацыёлаг, аспірант кафедры сацыялогіі БДУ, выкладчык Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Аляксандр Вараненка звяртае ўвагу на непаслядоўнасць рашэнняў, што прымаюцца чыноўнікамі ў сферы адукацыі. «Як можна зразумець пасыл прэзідэнта, які кажа пра тое, што ліміт рэформаў вычарпаны, і тут жа заяўляе, што педагогаў трэба ўзварушыць? Можна ўспомніць ліквідацыю профільнага навучання ў старэйшых класах для таго, як казалі ўлады, каб стварыць роўныя ўмовы для паступлення. Аднак тут жа быў уведзены асобны конкурс для паступлення ў ВНУ для гарадскіх і сельскіх абітурыентаў. Наша дзяржаўная машына адпраўляе ў грамадства супярэчлівыя імпульсы», — мяркуе Аляксандра Вараненка.

Выкладчык Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны тут жа прыводзіць лічбы сацыялагічнага даследавання 2007 года. Тады 95,4% апытаных педагогаў выказваліся за захаванне профільнай адукацыі, і, як паказалі вынікі цэнтралізаванага тэставання, узровень падрыхтаванасці вучняў, калі мелі месца класы з пэўным прадметным ухілам, быў больш высокім. У выніку пазней трэцяя частка апытаных настаўнікаў адзначыла, што ўвогуле не зразумела, для чаго ладзілася такая рэформа адукацыі.

## Магістратуры адкрылі дыханне

Былы прарэктар Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, прафесар Уладзімір Дунаеў крыху астуджае запал чыноўнікаў, якія прэзентуюць Кодэкс аб адукацыі як вялікі крок перад астатнімі краінамі.

«Ідэя адукацыйнага кодэкса — гэта не беларускае know how. Ёсць мадэльны адукацыйны кодэкс СНД. Ён быў створаны ў 1998 годзе, і краіны СНД мусілі прыняць адпаведныя нарматыўныя дакументы. Першай была Малдова, якая і ўвяла адукацыйны кодэкс. Але праіснаваў ён, здаецца, тыдні два, — робіць невялікі экскурс у гісторыю Дунаеў. — Потым парламент адмяніў яго, бо знайшоў дакумент недэмакратычным, «сырым». Беларусь быццам бы давяла ідэю кодэкса да рэалізацыі. Але насамрэч неабходныя пункты там не прапісаныя».

У прыватнасці размова ідзе аб заканадаўчым замацаванні нарматыву на фінансаванне адукацыі. У Законе «Аб адукацыі» прапісана, што бюджэтныя адлічэнні на адукацыю мусяць складаць па планах на 2011 год 5,5% ад ВУП. Але ўжо некалькі гадоў гэты нарматыў парушаецца, і сёлета чакаецца аналагічны вынік дзяржаўных асігнаванняў на адукацыю.

Прафесар Дунаеў прыводзіць у прыклад Еўропу, дзе нарматыў фінансавання адукацыі складае 10% ад ВУП. І хаця ён таксама парушаецца, кіраўнікі дзяржаў прынамсі апраўдваюцца за свае дзеянні ды імкнуцца выконваць прапісаны нарматыў.

Ёсць і яшчэ адзін важны аспект, які акадэмічная супольнасць Беларусі праігнаравала, у выніку яго ж і не атрымала. «У кодэксе хацелі закласці аснову адукацыйнага права. Але для гэтага трэба, каб суб'екты адносінаў былі аўтаномнымі. У Беларусі стварылі права, у якім адносіны па-ранейшаму рэгулююцца па прынцыпу «кіраўнік — падначалены», то бок Адміністрацыйным кодэксам, — зазначае Уладзімір Дунаеў. — На жаль, акадэмічная супольнасць гэтага не заўважыла і нічога не зрабіла на этапе, калі гэта можна было скарэктаваць. Таму адукацыйны кодэкс — гэта хутчэй устаў вартавой службы, чым закон аб адукацыі».

«У нас, канешне, ніколі не было акадэмічных свабодаў, але ў Законе «Аб адукацыі» быў замацаваны 34-ы артыкул акурат аб акадэмічных свабодах і ўніверсітэцкай аўтаноміі, — тлумачыць экс-прарэктар апальнага Еўрапейскага ўніверсітэта. — І ніхто не заўважыў, што ў 2009 годзе гэты артыкул быў выдалены, і потым не перайшоў у Кодэкс аб адукацыі. Хіба наша акадэмічная супольнасць пратэставала, абуралася? Ды нават не заўважылі! То бок сутнасці адукацыйных адносінаў у кодэксе не зафіксавалі, бо насамрэч гэта акт, які замацоўвае адміністрацыйнае самадурства. У нас няма ніякіх правоў, бо тое, што нам можна, вызначае адміністрацыя».

Разам з тым эксперт адзначае адзін істотны плюс новага дакументу — у Беларусі з'явілася прафесійная магістратура. «Рубінаў знішчыў прафесійную магістратуру, прывязаўшы яе да аспірантуры. Відаць, падумалі, што калі аспірант не паспявае падрыхтавацца за два гады да абароны дысертацыі, то трэба яму яшчэ год дадаць. Але гэта нічога не дало ў плане паляпшэння паказчыкаў абароны дысертацый. Магчыма, цяпер у нас з'явіцца паўнавартасная другая ступень вышэйшай адукацыі», — выказвае спадзяванні прафесар Дунаеў.

Варта дадаць, што, паводле міжнародных рэйтынгавых ацэнак, найперш адукаваныя людзі прыносяць дзяржаве грошы, то бок яны папросту ёсць гарантам эканамічнай стабільнасці краіны. «У Еўропе розніца даходаў за час працы чалавека з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй складае 119 тысяч долараў. Чалавек з вышэйшай адукацыяй плаціць больш падаткаў. Адукаваныя людзі больш увагі надаюць здароўю, гэта выгодна дзяржаве», — адзначае эканаміст Антон Балточка. У дакладзе ААН аб развіцці чалавека за 2010 год Беларусь заняла 61-е месца па індэксе развіцця чалавечага патэнцыялу. Аднак, як мяркуе эксперт, цяпер у краіне назіраецца вялікая інфляцыя вышэйшай адукацыі, яна не ёсць гарантам сацыяльнага ліфта ці матэрыяльнага дабрабыту.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 19 ВЕРАСНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніца, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «Час кіно: асацыяцыі Алега Сільвановіча». Дакументальны фільм (НГТРК).
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**11.00** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**12.10** Прыгодніцкі баявік «Мальтыйскі крыж» (Расія).
**14.00** Здароўе.
**14.30** «Ён сэрцам песню адчуваў». Дакументальны фільм.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыйны баявік «Таксі-4» (Францыя).
**17.05** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**18.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Камандзіроўка.
**22.00** Баявік «Канец гульні» (ЗША).
**23.55** Дзень спорту.
**00.10** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Прэм'ера. «Нона, давай!».
**23.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.25** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**14.45** «Вялікі горад».
**15.20** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** «Я-вандроўца».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Флэш.ка». Расія, 2006 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.05** «Запал і ўлада».
**10.40** Канцэрт «Christina Aguilera. Live and Down Under».
**12.25** Драма «Гульня слоў» (ЗША).
**14.20** Навіны надвор'я.
**14.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.55** Медычныя таямніцы.
**16.30** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Баявік «Маёр Вятроў» (Беларусь-Расія). 1-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт «Christina Aguilera. Live and Down Under».
**23.10** Авертайм.
**23.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**00.30** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**12.25** «Ранішняя пошта».
**12.55** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Каменская-6».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Гарадок».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Пятля».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Сумленны панядзелак».
**00.30** Серыял «Сталіца граху».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Акадэмічнае веславанне. Чэмпіянат Еўропы. Балгарыя.
**11.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Жанчыны/юніёры (Капенгаген, Данія).
**12.45** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Фінал.
**14.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Да 23 гадоў (Данія).
**18.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Нідэрланды).
**20.30** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Фінал.
**21.45** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle (Нідэрланды).
**00.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Да 23 гадоў (Капенгаген, Данія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** «Акварыум», серыял: 1 серыя.
**08.30, 12.05** «Малая Міс Цыганія», дак. фільм, 2009 г., Харватыя.
**09.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.25, 16.30** «Сыс пра Сыса», дак. фільм, 2010 г., Польшча.
**10.00** Эксперт.
**10.25, 14.45** «Заўтра пойдзем у кіно», маст. фільм, 2007 г., Польшча.
**12.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**13.05** Эксперт.
**13.30** «Акварыум», серыял: 1 серыя.
**14.20** ПраСвет.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 8 серыя.
**17.25** Зона «Свабоды».
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Палітычныя забойствы», дак. фільм, 2005 г., Францыя: 2 серыя: «Марцін Лютэр Кінг. Смерць у Мэмфісе».
**18.50** Вагон.
**18.55** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Салаўкі. Пачатак ГУЛагу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**22.00** «Заўтра пойдзем у кіно», маст. фільм, 2007 г., Польшча.
**23.40** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 20 ВЕРАСНЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніца, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Камедыйны серыял «Пары» (Расія).
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**12.10** Меладрама «Знікненне» (Расія). .
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**17.00** Камедыйны серыял «Пары» (Расія). Заключная серыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Ваенная драма «Браты» (ЗША).
**23.50** Дзень спорту.
**00.05** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Ахвяры калібра 7.62».
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

### ТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Флэш.ка». Расія, 2006 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Стацкі дараднік». Расія, 2005г.
**16.15** «Далёкія сваякі».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Рэкрут». ЗША , 2002г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

### лад

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** «Запал і ўлада».
**10.45** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**12.30** Авертайм.
**13.00** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**13.20** Эксцэнтрычная камедыя «Дванаццаць крэслаў» (СССР). 1-я серыя.
**14.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Баявік «Маёр Вятроў» (Беларусь-Расія). 2-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.00** «Беларуская часіна».
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт «U2. 360 At The Rose Bowl».
**23.40** Спорт-кадр.
**00.05** Эксцэнтрычная камедыя «Дванаццаць крэслаў» (СССР). 1-я серыя.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каменская-6».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Каменская-6».
**23.25** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Выклікаю дух Македонскага. Спірытызм». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Абвешчаны ў вышук».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** Прэм'ера. «Генералы халоднай вайны. Андрэй Грамыка».
**00.35** Вострасюжэтны серыял «Сталіца граху».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Мужчыны/юніёры (Капенгаген, Данія).
**14.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Да 23 гадоў (Данія).
**15.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Жанчыны (Данія).
**18.00** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Фінал.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.00** Бокс. ЗША.
**22.00** Бокс (Бухарэст, Румынія).
**00.00** Матаспартыўны часопіс.
**00.15** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Ле-Ман (Францыя). Агляд.
**00.45** Матаспорт. Тэст-драйв.
**01.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**02.15** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «На мяжы нормы», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**09.05** «Мой родны горад», серыял: 8 серыя.
**09.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.40** Еўропа сёння.
**10.10** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**10.40** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**11.10** «Ранча», серыял: 49 серыя.
**12.05** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**12.15** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Салаўкі. Пачатак ГУЛагу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**12.50** «На мяжы нормы», маст. фільм, 2000 г., ЗША.
**14.25** «Мой родны горад», серыял: 8 серыя.
**14.50** Еўропа сёння.
**15.15** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**15.50** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**16.25** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 9 серыя.
**17.25** Вагон.
**17.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 8 серыя.
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.40** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.10** «Дэтэрмінатар», серыял: 12 серыя.
**22.55** Басаножна па свеце (спазнаваўчая праграма).
**23.20** Аб'ектыў.
**23.45** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 21 ВЕРАСНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.25** «Сфера інтэрэсаў». Эканамічная праграма.
**08.35** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Пары» (Расія). Заключная серыя.
**11.00** Серыял «Пацалунак Сакрата».
**12.10** Меладрама «Крызіс Веры» (Украіна).
**14.00** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**15.50** «Эпоха».
**16.20** «Шклоўскі афорт». Дак. фільм.
**16.50** Серыял «На нажах». 1-я серыя.
**17.50** Серыял «Дыхай са мной». 1-я серыя.
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Драма «Татуіроўка ў выглядзе матыля» (Нідэрланды).
**23.55** Дзень спорту.
**00.05** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** Асяроддзе пасялення.
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Рэкрут». ЗША , 2002 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Ніна». Серыял.
**16.50** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Пастка для самотнага мужчыны». СССР, 1990 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дабро пажаліцца».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** «Запал і ўлада».
**10.45** Канцэрт «Mariah Carey. The adventures of Mimi».
**12.20** Рэальны свет.
**12.50** Спорт-кадр.
**13.20** Эксцэнтрычная камедыя «Дванаццаць крэслаў» (СССР). 2-я серыя.
**14.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.55** Медычныя таямніцы.
**16.30** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Баявік «Маёр Вятроў» (Беларусь-Расія). 3-я серыя.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** «Халі-Галі». Скетч-шоў.
**19.25** Хакей. КХЛ. Дынама (Рыга) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**21.45** Тэлебарометр.
**21.50** «Спортлато 5 з 36».
**21.55** КЕНО.
**22.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Канцэрт «Mariah Carey. The adventures of Mimi».
**00.30** Эксцэнтрычная камедыя «Дванаццаць крэслаў» (СССР). 2-я серыя.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Каменская-6».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вяртанне дадому».
**23.30** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.25** Навіны - Беларусь.
**00.35** Прэм'ера. «Гістарычны працэс».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Абвешчаны ў вышук».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Увага: вышук!».
**00.15** Серыял «Сталіца граху».

**EUROSPORT**

**09.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Ле-Ман (Францыя). Агляд.
**10.00** Матаспорт. Тэст-драйв.
**10.55** Падзея «Дыскавары». Формула 1.
**11.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**12.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Жанчыны (Данія).
**13.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Мужчыны (Данія).
**18.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету (Францыя). 1/2 фіналу.
**19.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету (Францыя). Фінал.
**20.00** Абранае па серадах.
**20.10** Абранае па серадах. Госць тыдня.
**20.25** Конны спорт. Шматбор'е (Вялікабрытанія).
**21.55** Навіны коннага спорту.
**22.00** Гольф. Тур PGA. Чэмпіянат BMW.
**23.00** Гольф. Vivendy Celebrity Trophy.
**23.30** Гольф. Жанчыны. Адкрыты чэмпіянат Іспаніі (Тэнэрыфэ, Іспанія).
**23.40** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.45** Ветразевы спорт. Rolex Fastnet.
**00.15** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**00.20** Снукер. Мастэрс (Бразілія). Фінал.
**01.30** Матаспартыўны часопіс.
**01.45** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Мужчыны (Данія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 8 серыя.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**09.00** «Мой родны горад», серыял: 9 серыя.
**09.25** На колах.
**09.55** Рэпартэр.
**10.20** Асабісты капітал.
**10.35** Госць «Белсату».
**10.50** «Ранча», серыял: 50 серыя.
**11.40** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.50** Беларусы ў Польшчы.
**12.10** «Каханне без візы», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**12.45** «Арол», серыял: 8 серыя.
**13.45** На колах.
**14.15** «Мой родны горад», серыял: 9 серыя.
**14.40** Рэпартэр.
**15.05** Асабісты капітал.
**15.20** Два на два (тэледыскусія).
**15.45** «Каханне без візы», дак. фільм, 2001 г., Польшча.
**16.25** Прыватная калекцыя.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 10 серыя.
**17.25** МакраФон: XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: выступ Касі і Мажэны Жменек ды Ілоны Карпюк з сябрамі.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 12 серыя.
**18.55** Беларусы ў Польшчы.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Мікалай Статкевіч», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.50** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 7 серыя.
**22.20** Два на два (тэледыскусія).
**22.45** Аб'ектыў.
**23.10** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 22 ВЕРАСНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.30** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «На нажах». 1-я серыя.
**11.00** Серыял «Дыхай са мной». 1-я серыя.
**12.10** Меладрама «Каханне пад наглядам» (Расія).
**13.55** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Казка і ў сне і наяве». Дак. фільм.
**16.15** Здароўе.
**16.45** Серыял «На нажах». 2-я серыя.
**17.50** Серыял «Дыхай са мной». 2-я серыя.
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Клуб рэдактараў.
**22.30** Новае расійскае кіно. Драма «Цуд» (Расія).
**00.40** Дзень спорту.
**00.55** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Хачу ведаць».
**13.40** «Кантрольны закуп».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Участковы дэтэктыў».
**16.55** «Давай ажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Новая камедыя «Трохі не ў сабе».
**22.15** «Атлантыда». Шматсерыйны фільм.
**23.15** «Несакрэтныя матэрыялы».
**23.45** «Зваротны адлік».
**00.15** Прэм'ера. «Умовы кантракту». Шматсерыйны фільм.
**01.10** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Фільм «Пастка для самотнага мужчыны». СССР, 1990 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Ніна». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Хімера». ЗША - Канада - Францыя , 2009 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял. Заключная серыя.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** «Запал і ўлада».
**10.45** Канцэрт «Chris Rea. The Road to Hell…».
**12.10** Рэальны свет.
**12.45** Страсці па культуры.
**13.30** Эксцэнтрычная камедыя «Залатое цяля» (СССР). 1-я серыя.
**14.55** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.00** Медычныя таямніцы.
**16.35** Медычныя таямніцы +.
**16.45** Баявік «Маёр Вятроў» (Беларусь-Расія). 4-я серыя, заключная.
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.00** «Беларуская часіна».
**20.50** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт «Chris Rea. The Road to Hell…».
**22.55** Час футболу.
**23.35** Эксцэнтрычная камедыя «Залатое цяля» (СССР). 1-я серыя.

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Вяртанне дадому».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Прамы эфір».
**21.35** Тэлесерыял «Вяртанне дадому».
**23.30** Тэлесерыял «Дурнаватая».
**00.25** Навіны - Беларусь.
**00.35** Прэм'ера. «Паядынак».

**НТВ**

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Абвешчаны ў вышук».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.25** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.15** Сёння.
**23.40** «Пах болю».
**00.35** Серыял «Сталіца граху».

**EUROSPORT**

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня. Часопіс.
**10.15, 14.15** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Мужчыны (Капенгаген, Данія).
**11.30** Снукер. Мастэрс (Сан-Паула, Бразілія). Фінал.
**13.00** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Гонка з паасобным стартам. Жанчыны (Капенгаген, Данія).
**15.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140 (Казахстан).
**17.00** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Змяшаная эстафета (Чэхія).
**19.00** Спідвэй. Гран-пры (Італія).
**20.00** Спідвэй. Гран-пры (Швецыя).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. The Battle.
**00.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**23.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.40** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Змяшаная эстафета (Чэхія).

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 7 серыя.
**08.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 12 серыя.
**08.50** Эксперт.
**09.15** «Мой родны горад», серыял: 10 серыя.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.10** «Рука цырульніка», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**11.00** «Ранча», серыял: 51 серыя.
**11.50** Навігатар.
**12.05** Госць «Белсату».
**12.20** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 7 серыя.
**12.50** «Дэтэрмінатар», серыял: 12 серыя.
**13.35** Праект «Будучыня».
**14.05** «Мікалай Статкевіч», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**14.30** «Мой родны горад», серыял: 10 серыя.
**14.55** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**15.20** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**15.40** «Рука цырульніка», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**16.30** Беларусы ў Польшчы.
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 4 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнавальная праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Госць «Белсату».
**18.20** «Акварыум», серыял: 1 серыя.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**20.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Горад над Ракой Чорнага Цмока», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**22.35** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 3 серыя.
**23.35** Аб'ектыў.
**00.00** Гарачы каментар.

## 25 ВЕРАСНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.50** Канцэрт «Залаты грамафон» (2008г.).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.40** Відэафільм АТН «Шлях праз Масты» цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** «Сваты-4» (Украіна). 2-я серыя.
**12.10** Меладрама «Вас чакае грамадзянка Ніканорава» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.35** Баявік «Рызыка без кантракту» (Расія).
**18.10** Суперлато.
**19.15** Камедыя «Зануда» (Францыя).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Патрыятычная драма «Брэсцкая крэпасць» (Расія-Беларусь).
**00.25** «Сваты-4». Камедыйны серыял (Украіна). 2-я серыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**12.40** Прэм'ера. «Міхась Пугаўкін. Галоўны герой другога плану».
**13.40** «Другі міжнародны фэст пародый «Вялікая розніца ў Адэсе». Фінал.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.20** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**18.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Фільм «Дом Сонца».
**23.30** Фільм «Сенсацыя».

ТВ

**07.05** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**07.30** Фільм «Кліент». ЗША, 1994г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял Заключныя серыі.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Дынама» Мінск - «Днепр» Магілёў. Прамая трансляцыя.
**16.00** «Пяць гісторый».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Геніяльны шпік».
**17.45** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Дэкан Спэнлі». Вялікабрытанія - Новая Зеландыя, 2008г.
**22.30** Фінал VII Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу эстрадных выканаўцаў «Усходні кірмаш».
**01.15** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**06.15** Прыгоды Агента 007. Фільм (Вялікабрытанія- ЗША).
**08.45** «Правы чалавека». Аўтарская праграма.
**09.00** Дабравест.
**09.30** Мір вашай хаце.
**09.40** Гаспадар.
**10.10** Тэлебарометр.
**10.15** Камедыйны анімацыйны фільм «Кукарача» (Расія).
**11.50** Рэальны свет.
**12.25** «Жыццё распісала ўсе ролі сур'езна». Дакументальны фільм (НГТРК).
**13.10** «Страсці па культуры».
**14.00** Серыял «Маргоша» (Расія).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Прамая трансляцыя.
**19.55** «Смешная часіна».
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Прыгоды Агента 007. Фільм (Вялікабрытанія -ЗША).
**23.45** Крымінальны трылер «Несмяротныя» (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** Фільм «Яе сэрца». 2009 г.
**08.40** Тэлесерыял «Дашнікі. Працяг».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Фільм «Залатая баба».
**13.30** «Смехапанарама».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** «Гарадок». Дайджэст.
**15.25** Прэм'ера. «Геній рускага вышуку». Дакументальны фільм.
**16.20** Дэтэктыў «Начное здарэнне».
**18.05** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Прадказанне». 2011 г.
**22.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.55** Фільм «Дарога».

НТВ

**07.25** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.50** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.05** «Крамлёўскія дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Таемны шоў-бізнэс. Людміла Зыкіна: скарбы каралевы».
**22.50** «Нтвшнікі».
**23.50** Фільм «Плябан».

EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Марафон. Берлін (Германія).
**12.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету. Мужчыны (Капенгаген, Данія).
**18.00** Супербайк. Чэмпіянат свету (Монца, Італія).
**18.05** Супербайк. Чэмпіянат свету (Монца, Італія). Заезд 1-ы.
**19.05** Супербайк. Чэмпіянат свету (Монца, Італія). Заезд 2-і.
**20.05** Суперспорт. Чэмпіянат свету (Монца, Італія).
**21.00** Мотаспартыўны часопіс.
**21.15** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Мужчыны. Гонка пераследу (Чэхія).
**21.45** Летні біятлон. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Гонка пераследу (Чэхія).
**22.15** Бокс (Капенгаген, Данія).
**00.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Італія). Агляд.
**00.30** Гольф. Ірландыя. Агляд.
**01.30** Мотаспартыўны часопіс.
**01.45** Супербайк. Чэмпіянат свету (Монца, Італія). Заезд 2-і.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** На колах.
**07.40** Госць «Белсату».
**08.00** «Доктар Марцін», серыял: 3 серыя.
**08.45** «Сонечная дзіда», серыял: 4 серыя.
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.40** Чаму дэмакратыя? 1 серыя: «Прашу галасаваць за мяне».
**10.35** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**11.50** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**12.20** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** На колах.
**13.20** «Сонечная дзіда», серыял: 4 серыя.
**13.45** Калыханка для самых маленькіх.
**14.15** Невядомая Беларусь: «Верасень 1939. Як нас вызвалялі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**14.45** «Доктар Марцін», серыял: 3 серыя.
**15.30** «Спадар Забойства», маст. фільм, 1998 г., ЗША: ч. 1.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Акварыум», серыял: 2 серыя.
**18.15** Два на два (тэледыскусія).
**18.40** «Васіль Быкаў. Вяртанне», дак. фільм, 2004 г., Беларусь.
**19.00** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** «Палітычныя забойствы», дак. фільм, 2005 г. Францыя: 3 серыя: «Смяротны запавет міру Магатмы Гандзі».
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.40** Эксперт.
**22.10** Фільматэка майстроў: «Варажба жарлянкі», маст. фільм, 2005 г., Польшча–Германія.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**00.30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, афоміўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

## ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня

Кассир Всего

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

МЕРКАВАННЕ

# БЫЦЬ КРЫТЫЧНЫМ ДА ДОГМАЎ

**Пасля апошніх падзей у арабскіх краінах шматлікія лібералы пачалі звязваць будучыню лібералізму з ісламскім светам. Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Гі Сарманам, адным з вядучых ліберальных філосафаў Францыі і Еўропы, дарадцам прэзідэнта Паўднёвай Карэі, аўтарам шматлікіх кніг, кавалерам Ордэну Ганаровага Легіёну.**



***— У сваіх інтэрв'ю вы кажыце, што ўдзельнікам цяперашніх моладзевых пратэстаў ідэйна найбольш блізкая ліберальная тэорыя. Растлумачце гэты тэзіс, калі ласка.***

— З-за таго, што мы жывём у глабалізаваным свеце, моладзь паўсюль падзяляе адны і тыя ж каштоўнасці. Натуральна, тут ёсць шмат дэталяў, якія мы і ведаем, і не ведаем. Напрыклад, у Еўропе ёсць забабоны, што рускія нас не любяць. Аднак хаця маладыя людзі і належаць да розных нацый і культур, канцэпцыя індывідуалізму з'яўляецца ўніверсальнай. Адначасова вялікую ролю адыгрывае інтэрнэт, які дапамагае гэтым людзям аб'яднацца і сказаць уладам і ўсяму свету — мы ёсць, мы падзяляем адны і тыя ж ідэі і патрабуем, каб нас паважалі.

***— Сёння ўжо ёсць спробы стварэння палітычных партый на базе інтэрнэту. Напрыклад, створаная ў Швецыі Партыя піратаў. Аднак «піраты» — партыя левага накірунку. Піраты лічаць, што феномен інтэрнэту ў тым, што ён стварае некамерцыйную прастору, дзе няма разумення прыватнай уласнасці. Хіба гэта не супярэчыць ліберальнай дактрыне?***

— Для мяне як ліберала не важна, называюць сябе тыя ж «піраты» правымі або левымі. Галоўнае, што яны выступаюць за грамадства, у якім людзі паважаюць адзін аднаго. Інтэрнэт дапамагае будаваць такую грамадскую супольнасць. Дэмакратыя ў разуменні ліберала — гэта перш за ўсё права меншасці і павага да яе. Інтэрнэт якраз і стварае такую формулу дыскусіі.

***— Авангард цяперашніх рэвалюцый, якія вы характарызуеце як ліберальныя, відавочна, знаходзіцца ў арабскіх краінах. Наколькі рэальны ліберальны праект у рэгіёне з ісламскай культурай і традыцыяй?***

— Ліберальная традыцыя даўно існуе на Усходзе. У другой палове XIX — першай палове XX стагоддзя ў ісламскіх краінах спрабавалі будаваць дэмакратычнае грамадства, развіваць свабодную гаспадарку. Узгадайце Егіпет, Іран, Сірыю. Там на той час існавалі больш-менш вольныя выбары, акадэмічная дыскусія, ліберальная гаспадарка. Эксперымент закончыўся ў 1960-я гады, калі ў арабскіх краінах да ўлады прыйшлі вайскоўцы. Я не буду падрабязна раскрываць прычыны такога павароту, да якіх перш за ўсё можна аднесці працэс дэканалізацыі і ўплыў Савецкага Саюза. Галоўнае тут тое, што эпосе вайсковых рэжымаў і ісламскага экстрэмізму папярэднічала эпоха плюралізму. У гэтым няма нічога дзіўнага, калі мы ўважліва прааналізуем канцэпцыю ісламу. Тут, у адрозненне ад каталіцызму або пратэстантызму, значна больш накірункаў і школ. Варта таксама ўзгадаць, што іслам — гэта адзіная рэлігія ў свеце, якую стварыў бізнэсмэн. Прарок Мухамед быў прафесійным камерсантам. І цяперашняе маладое пакаленне, відавочна, не разглядае іслам як нешта палітычнае. Іслам не ёсць перашкода для лібералізму.

***— Ці з той жа серыі, як і ў арабскім свеце, нядаўнія моладзевыя пратэсты ў Вялікабрытаніі?***

— І так, і не. У тэхнічным вымярэнні яны падобныя. Як і ў Егіпце, вялікую ролю для мабілізацыі незадаволеных адыграў інтэрнэт. Розніца ў тым, што ў Еўропе іншыя праблемы. Перш за ўсё, вялікае беспрацоўе сярод маладых людзей. Вельмі цяжка знайсці працу тым, каму менш за 25 гадкоў. У Аб'яднаным каралеўстве ёсць яшчэ адна праблема — эміграцыя. Гэта парадокс — мы запрашаем сотні тысяч маладых эмігрантаў-гастарбайтэраў, аднак мы не здольныя інтэграваць іх у соцыум.

***— Калі мы кажам пра лібералізм, то сутыкаемся з праблемай штодзённай этыкі. Можна быць левым і весці левы лад жыцця — слухаць адпаведную музыку, глядзець адмысловае левае кіно. Можна быць неанацыстам і жыць адпаведна скінхэд-стайл. Што значыць быць лібералам у шэрых буднях?***

— Мяркую, гэта проста быць крытычным да догмаў. Нам патрэбная супярэчнасць. Капіталізм не можа існаваць без супярэчнасцяў. Таму прынцып лібералізму — адмова дамінавання. Нас адрозніване ад тых жа левых тое, што яны намагаюцца заўсёды быць манапольнымі ўладальнікамі канчатковай ісціны. Гэта як нейкая рэлігія ці форма рэлігіі. Можна назваць гэта бальшавізмам.

***— Вы вельмі скептычна ставіцеся да перспектыў ліберальнай рэвалюцыі ў Расіі і краінах былога СССР. Пры гэтым, аднак, вы ў захапленні ад Паўднёвай Карэі.***

— Праблема Расіі ў тым, што рэвалюцыя там у поўным сэнсе гэтага слова не адбылася. Так, СССР бы разбураны, аднак старая камуністычная эліта здолела застацца пры ўладзе. Натуральна, яны трохі пераарганізаваліся, аднак кардынальных зменаў у эліце ўсё ж не адбылося. Тыя ж людзі засталіся ў офісах. Паўднёвая Карэя на працягу жыцця аднаго пакалення здолела прайсці шлях ад вайсковай дыктатуры да ліберальнай дэмакратыі. Усё таму, што простыя людзі хацелі сапраўдных дэмакратычных перамен, змагаліся за іх супраць дыктатуры і ў выніку дамагліся свайго. Гэта галоўная розніца паміж расіянамі і карэйцамі. Пры гэтым, аднак, я не магу не заўважыць, што ў расійскім грамадстве стала менш страху, з'явіўся падмурак для вольнай дыскусіі.

***— Што вы рабілі ў маі 1968 года падчас студэнцкай рэвалюцыі ў Францыі?***

— Я быў актывістам адной з анархісцкіх груповак. Я заснаваў анархіст Даніэль Кон-Бендзіт, цяперашні лідар французскіх Зялёных. Мы былі вельмі актыўнымі ў барацьбе з сістэмай. Мы хацелі права на свабоду думкі. Мы патрабавалі сэксуальнага разняволення. Гэта было актуальна ў той час. Адначасова мы змагаліся з іншымі аўтарытарнымі тэндэнцыямі ў студэнцкім асяроддзі — камуністамі і маістамі.

***— Калі параўноўваць цяперашнія моладзевыя бунты і рэвалюцыю 1968 года, у іх ёсць нешта агульнае?***

— Ёсць шмат агульнага. Тая ж тэма сэксу. Тэма сэксу можа не прысутнічаць на транспарантах, аднак ён так ці інакш праяўляецца. У прынцыпе, гэта характэрна для ўсіх рэвалюцый. Згадайце Вялікую французскую рэвалюцыю. Нават падчас бальшавіцкай рэвалюцыі ставілася пытанне вольнага кахання.

***— У інтэрнэце шмат парнаграфіі. Можа, яна таксама спрыяе росту рэвалюцыйных настрояў?***

— Безумоўна. Асабліва ў арабскіх краінах, дзе ў сям'і жанчына ва ўсім падпарадкоўвацца мужчыне. Жанчыны, наведваючы парнаграфічныя сайты, разбураюць архаічную мараль, узнікае патрэба нейкіх новых пачуццяў, вызвалення.

***— У 1980-я гады вы былі адным з вядучых прапагандыстаў амерыканскай кансерватыўнай рэвалюцыі ў Еўропе. Нават выдалі кніжку «Кансерватыўная рэвалюцыя». Мяне цікавіць ваша думка пра культурнае вымярэнне той рэвалюцыі. Яе сімваламі сталіся такія супярэчлівыя прадукты, як фільмы пра Рэмба або Рокі. Няўжо еўрапейскі інтэлектуал можа падтрымліваць такое мастацтва?***

— Я ніколі не быў прыхільнікам Рэйгана ці аматарам Галівуда тых часоў. Для мяне было важна паказаць, што па той бок Атлантыкі нешта адбываецца. У Еўропе тады было шмат журналістаў, якія бачылі ў Рэйгане нейкага дурнога каўбоя. Я казаў — не, гэта нешта большае. Гэта рэакцыя пратэстанцкай Амерыкі на сацыялізм, на эканамічны спад 1980-х, на сэксуальную рэвалюцыю. Я хацеў сказаць: тое, што адбываецца ў ЗША, вельмі амерыканскае. Я хацеў сказаць, што рэчы больш складаныя, чым нам здаецца. Нават калі вы ў 1980-я былі супраць Рэйгана, а зараз выступаеце супраць Сары Пэйлін, вы павінны спрабаваць іх зразумець.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Замест «шматвектарнага балансавання» паміж «вашымі і нашымі» Януковіча можа чакаць лёс Лукашэнкі, які ў крытычны момант фактычна апынуўся «паміж молатам і кавадлам». З аднаго боку, «беларускі сцэнар» азначае шлях праз Мытны саюз да страты суверэнітэту, а за ім і ўлады. З іншага — яго цяперашняя падрыхтоўка да «вайны» з Расіяй здаецца хутчэй міфам, з дапамогай якога ўлада імкнецца аднавіць падтрымку хоць часткі насельніцтва.

**«Тиждень» (Украіна)**

Усё адбываецца на непрыемным для прэзідэнта фоне: палітычная напружанасць не спадае, эканамічны крызіс нарастае. Захад патрабуе вызвалення палітвязняў, Расія настойвае на больш цесных эканамічных адносінах, простыя беларусы патрабуюць грошай і б'юцца ў чэргах ля абменных пунктаў. Аляксандр Лукашэнка кідаецца паміж сакрэтнымі перамовамі з Еўропай і неабходнасцю даваць шырокія абяцанні Маскве ў абмен на новыя крэдыты. За любой незадаволенасцю ўладам бачацца зарніцы рэвалюцыі. А тут яшчэ гэты жахлівы тэракт і дзіўныя тэрарысты, якія разбурылі апошнюю нацыянальную ілюзію — ілюзію бяспекі. Ці супакоіць грамадства суд над Канавалавым і Кавалёвым? Ці досыць ва ўлады аргументаў, каб назваць іх тэрарыстамі? У сённяшніх адносінах беларусаў з уладай з'явілася занадта шмат сумневаў.

**«Коммесантъ — власть» (Расія)**

Дзеля выратавання свайго рэжыму Аляксандр Лукашэнка можа пайсці на ўсе ўмовы, якія высоўваюцца Еўрапейскім саюзам. Інакш яму не вытрымаць ціску Масквы і не выйсці з фінансава-эканамічнага крызісу. Гэтыя пагрозы добра разумеюць у Брусэлі і іншых еўрапейскіх сталіцах. Як і тое, што выдача крэдытаў Мінску падоўжвае існаванне аўтарытарнага рэжыму. І ўсё ж існуе высокая верагоднасць, што Захад у чарговы раз пагодзіцца выдаць крэдыт Мінску. Але што будзе далей? Ці стане Лукашэнка выконваць умовы, якія высоўваюцца Брусэлем, і весці дыялог з апазіцыяй, прытрымліваючыся нормаў, прынятых у дэмакратычным грамадстве? У гэта мала верыцца: змястоўных змен ва ўнутранай палітыцы беларускага прэзідэнта не будзе. Прыроду рэжыму не зменіш, і пасля атрымання грошай усё вернецца на кругі свае. Да наступнага крызісу, які зноў будзе пагражаць існаванню рэжыму.

**«Зеркало недели» (Украіна)**

Відавочна, што ў беларускай эканоміцы маса праблем. Крэдытаў і субсідый ад Захаду і Расіі чакаць не варта. Золатавалютныя рэзервы на мінімуме. Беларускі рубель абваліўся. Замежнай валюты ў абменніках няма. І як следства ўсяго гэтага — істотна пагаршаецца ўзровень жыцця беларускіх грамадзян. У такой сітуацыі Захад проста павінен чакаць. Лукашэнка неўзабаве павінен сам пайсці на саступкі.

**«American Voice» (ЗША)**

Чакаць, што беларускую частку МТС нехта захоча купіць за $1 мільярд, не варта. Ёсць маса гульцоў, якія працуюць на новых рынках, але выпадак з Беларуссю асобны: у адрозненне ад мноства іншых краін, з Беларусі фактычна немагчыма вывесці заробленыя сродкі. У той жа час еўрапейскія гульцы, якія працуюць на доўгую перспектыву, такія, як Orange ці Vodafone, бачаць непрыемнасці МТС і разумеюць, што могуць апынуцца ў падобнай сітуацыі.

**«Московские новости» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЗША. КАНСЕРВАТЫЎНЫЯ ЗОМБІ ПАВІННЫ ПАМЕРЦІ

Амерыканскі кансерватыўны свет, палітычным рупарам якога ёсць дзеючая пры партыі рэспубліканцаў групоўка Tea Party, раз'юшаны. Прычына — новая кампутарная гульня, якая трыумфальна крочыць па амерыканскім інтэрнэце. Забаўка называецца «Tea Party Zombies must die!» (англ.: «Зомбі з чайнай партыі павінны памерці»). Сярод персанажаў — зомбі, якія, на думку аўтараў, мусяць памерці, — лёгка пазнаецца ўвесь актыў Tea Party: Сара Пэйлін, Глен Бек. Місія гульца — знішчыць усіх. Можна выкарыстоўваць пры гэтым любую зброю — ад пісталета да сякеры або пілы. Нічога дзіўнага, што крывавая гульня выклікала пратэсты з боку электарату кансерватараў. Яны патрабуюць забароны «стралялкі». Аднак самае цікавае ў тым, што некаторыя рэспубліканцы лічаць, што патрабаваць ад чыноўнікаў забароны такога прадукту, як кампутарная гульня, значыць здрадзіць ідэйным асновам кансерватызму. Адпаведна яму, дзяржава не мае права ўмешвацца ў жыццё грамадзян. «Патрабаваць забарону гульні — значыць парушаць тэорыю асабістай свабоды», — у прыватнасці заявіў былы кандыдат ад рэспубліканцаў Майк Хакабі.

**По матэрыялах «TAZ» (Германія)**

### РАСІЯ. АНТЫЎРАДАВЫЯ СПЕКУЛЯЦЫІ НА ТЭМЕ АВІЯКАТАСТРОФЫ

У Расіі перадвыбарчая ліхаманка. Таму нічога дзіўнага, што чырвона-карычневыя паспрабавалі выкарыстаць аварыю з самалётам у Яраслаўлі супраць кіруючага тандэма Пуцін—Мядзведзеў. Іх абвінавацілі ў тым, што менавіта яны адказныя за трагедыю. Логіка тут наступная: з-за таго, што ў Яраслаўлі ў той жа дзень праводзіўся інавацыйны форум з удзелам Дзмітрыя Мядзведзева, аэрапорт не працаваў у нармальным рэжыме, што, быццам, і сталася прычынай аварыі. Адзін з патрыятычных сайтаў піша: «Яраслаўскі аэрапорт маленькі, таму паласа была занятая асабістай авіяцыяй людзей з «эліты», якія прыляцелі на «шабаш інаватараў», што праводзіцца ў Яраслаўлі, і самалёт з хакеістамі ўзлятаў са скарочанай паласы, не прызначанай для машын яго класа. Таму не набраў неабходнай хуткасці, каб звычайна ўзляцець». Не падабаецца патрыётам і афіцыйная версія, адпаведна з якой прычынай аварыі стала няякаснае паліва. «Атрымліваецца, што «эліце» наліваюць якаснае паліва, а «быдляку» — няякаснае?» — абураецца апазіцыя. Застаецца дадаць, што ўсе спробы патрыётаў зрабіць крайнім Мядзведзева, калі меркаваць па рэакцыі ў інтэрнэце, расійская публіка не зразумела і ўспрыняла абыякава.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ШУКАЮЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВУ МАРЫНЕ ЛЕ ПЭН

13 верасня тры ўльтраправыя рухі — Партыя Францыі, Нацыянальны рэспубліканскі рух (Mouvement National Republicain) і Новая народная правая партыя, кіраўнікамі якіх ёсць былыя сябры Народнага фронту, — утвораць адзіны блок і высунуць кандыдата на наступныя прэзідэнцкія выбары. Меркаваны кандыдат трох рухаў — Карл Лан, былы генсек Нацыянальнага фронту, які заснаваў Партыю Францыі пасля сваркі з Жан-Мары Ле Пэнам. «Мы правядзём кампанію, заснаваную на нацыянальнай правай ідэалогіі, а не на дзяржаўнай і свецкай дэмагогіі, як гэта робіць Марына Ле Пэн», — заявіў Карл Лан. Нагадаем, што Марына Ле Пэн намагаецца трансфармаваць Нацыянальны фронт у адэкватную ў вачах сярэдняга класа партыю. На думку правых, гэта здрада. «Мы захопім гістарычную электаральную прастору Нацыянальнага фронту, увасабленнем якога быў Жан-Мары Ле Пэн, а не яго дачка Марына», — сказаў Карл Лан. Тое, што шанцы ў гэтай кампаніі мізэрныя, відавочна. Таксама як і тое, што яны сваімі дзеяннямі дапамогуць Ніколя Сарказі адцягнуць галасы ў Марыны Ле Пэн.

**Па матэрыялах французскай прэсы**

### ГЕРМАНІЯ. СІМВОЛІКУ ГДР ЗАБАРОНЯЦЬ?



Нямецкія кансерватары з Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (CDU) будуць дабівацца забароны сімволікі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. З такой ініцыятывай выступіў Ота Вульф, кіраўнік секцыі, якая аб'ядноўвае ветэранаў партыі. Ветэранаў, па словах Вульфа, непакоіць тое, што апошнім часам у Берліне і іншых гарадах былой ГДР можна сустрэць людзей, апранутых у форму вайскоўцаў Усходняй Германіі. Як правіла, гэта студэнты або артысты, якія за кошт маскараду прываблівацюь турыстаў. Аднак для CDU сімволіка ГДР не атракцыён, а «здзек з памяці ахвяр сацыялістычнай дыктатуры». Кансерватары таксама нагадваюць, што менавіта такія касцюмы, як на цяперашніх артыстах, былі на жаўнерах ГДР, якія стралялі па палітычных уцекачах. Ідэя CDU, здаецца, будзе мець практычную рэалізацыю — федэральнае міністэрства юстыцыі ўжо пачало распрацоўку прававой базы пад забарону выявы молата і цыркуля (усходненямецкі аналаг сярпу і молата).

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

КАНГРЭС

# З КІМ ВЫ, МАЙСТРЫ КУЛЬТУРЫ?

**9–11 верасня ў польскім Вроцлаве прайшоў Еўрапейскі кангрэс культуры, які сабраў сучасную культурную эліту кантынента. Прапануем рэпартаж з Вроцлава журналіста «НЧ» Алега Новікава.**



Мерапрыемства адбывалася ў так званай Зале стагоддзя — велізарным комплексе, пабудаваным па праекце славутага архітэктара Макса Берга яшчэ ў 1913 годзе ў гонар стагоддзя перамогі над Напалеонам. Гэты будынак лічыцца класікай нямецкага архітэктурнага экспрэсіянізму, які натхніў шматлікіх мастакоў на тое, каб здзейсніць нешта падобнае. Сярод іх, здаецца, быў і наш Лангбард, які праектаваў мінскі Тэатр оперы і балета. Контуры вроцлаўскай Залы стагоддзя знешне вельмі нагадваюць будынак на плошчы Парыжскай камуны.

Так ці інакш, калі бачыш у Вроцлаве твор Берга, які візуальна дамінуе над прасторай, міжволі складваецца ўражанне, што ты ў Мінску. Шакавала поўная адсутнасць паліцыі. Нягледзячы на тое, што побач з залай туды-сюды хадзіла мноства людзей, прычым некаторыя з півам, паліцыя ігнаравала мерапрыемства. І, як не дзіўна, усё было мірна і ціха.

Нават на цырымоніі адкрыцця кангрэсу, які наведалі прэзідэнт Браніслаў Камароўскі і спікер Еўрапарламенту Ежы Бузэк, у плане бяспекі было досыць сціпла. Прэзідэнта і спікера Еўрапарламенту звонку будынка ахоўвалі пару машын і тузін агентаў. Гэта пры тым, што касцяк удзельнікаў кангрэсу складалі маладыя артысты, сярод якіх шмат людзей анархічных поглядаў.

На адкрыцці Камароўскі зрабіў прамову. Ён казаў пра тое, што Еўропа заканчваецца там, дзе заканчваецца культура, а галоўная рыса культуры — павага да адрознага. У якасці доказу важнасці кантактаў паміж рознымі культурамі ён узгадаў анекдот. «Падчас урачыстасцяў, прысвечаных 750-й гадавіне паходу татара-манголаў на Польшчу, галоўнай ахвярай якога, дарэчы, стаў Вроцлаў, мангольскі пасол сказаў, што яму ўсё роўна, хто тады перамог, а хто прайграў. Галоўнае, што мы, палякі і манголы, сустрэліся», — сказаў дыпламат.

Камароўскі пры ўсім яго статусе не быў хэдлайнерам мерапрыемства. Парадак дня меўся сфармуляваць славуты сацыёлаг Зігмунд Бергман. Яго даклад заняў большую частку цырымоніі адкрыцця. Бергман, па-сутнасці, пераказаў тэзісы сваёй апошняй кніжкі «Культура ў зменлівай сучаснасці». Філосаф лічыць, што галоўным дыягназам часу ёсць нездаровая хуткая дынаміка культурных запытаў. Культурныя запыты фармуюцца на базе штучна створанай рэкламы, а не на падмурку сталых норм і традыцый. Выйсце (прынамсі ў Еўропе) ён бачыць у тым, каб дзяржава ўзяла на сябе незвычайную функцыю — занялася арганізацыяй сустрэчы спажыўцоў культуры і яе стваральнікаў.

Аднак на кангрэсе найбольшы інтарэс выклікалі падзеі ў арабскіх краінах і цунамі маладзевых пратэстаў, якія нядаўна пракаціліся па Еўропе. Шмат казалі пра новую старонку ў грамадска-палітычнай гісторыі Еўропы і пра тое, якія культурныя прадукты здольныя нарадзіць новыя грамадскія рухі.

Асобна адзначалася, што арабская вясна значыць, па сутнасці, правал еўрапейскай канцэпцыі разумення іншых народаў і іх культур. Еўрапейцы толькі пасля Тунісу зразумелі, што Усход — гэта не вярблюды, не танец жывата і злосныя ісламісты. Трэба шукаць новую метадалогію даследавання іншых культур, казалі ў Вроцлаве.

Для прысутных на кангрэсе беларусаў, безумоўна, была вельмі цікавай дыскусія пра афіцыйныя культуры, якія існавалі ў арабскіх краінах падчас дыктатур. Як распавядалі тунісцы і егіпцяне, гэта быў адметны мікс архаічнага фальклору і папсы, створаны артыстамі, якіх рэжыму ўдалося перакупіць.

Тое, што рэвалюцыйная моладзь у тых жа Егіпце і Тунісе актыўна выкарыстоўвала інтэрнэт, прыцягнула вялікую ўвагу да артэфактаў, створаных з дапамогай новых тэхналогій.

Кангрэс у Вроцлаве праходзіў на фоне выбарчай кампаніі ў Сейм. Да выбараў застаўся роўна месяц, і эмоцыі ўсё больш зашкальвалі. Кансерватары з партыі «Права і Справядлівасць» — галоўныя канкурэнты кіруючай у Польшчы ліберальнай «Грамадзянскай платформы» — відавочна не маглі прайсці міма кангрэсу. Яны яўна баяліся, што лібералы паспрабуюць зрабіць сабе піяр на тым, што адбываецца ў Вроцлаве. На мерапрыемства, якое фармальна арганізаваў ліберальны ўрад, прыехалі такія культурныя гранды, як Алів'ера Таскані (геній рэкламы), Гі Сарман (ліберальны філосаф), Яцэк Жакоўскі (папулярны польскі журналіст), музыкі з культавага гурта «Radiohead» і іншыя.

У выніку правая прэса пачала буйную кампанію супраць кангрэсу. Асабліва ахвотна правыя шукалі праекцыі паміж цяперашнім кангрэсам і Кангрэсам інтэлектуалаў у абарону міру, які адбыўся таксама ў Вроцлаве ў 1948 годзе. Тая акцыя была адным з самых пампезных савецкіх прапагандысцкіх шоў «халоднай вайны», на якое Маскве ўдалося выцягнуць еўрапейскую культурную эліту. «У абарону міру» прыехалі выступаць Дзьёрдзь Лукач, Луіс Арагон, Пабла Пікаса і іншыя. Апагеем кангрэсу 1948 года стаў выступ Аляксандра Фадзеева. Ён прамым тэкстам заявіў, што еўрапейская эліта павінна падтрымліваць СССР, паколькі яна існуе дзякуючы простаму савецкаму жаўнеру, які знішчыў фашызм.

Нядзіўна, што правыя СМІ называлі цяперашні кангрэс клонам кангрэсу 1948 года, з той розніцай, што яго выступоўцы заклікаюць падтрымаць не камунізм, а «Грамадзянскую платформу». Пісалі, што ўдзельнікі кангрэсу страшна далёкія ад народа. Па словах правых каментатараў, на кангрэсе можна было вывучыцца толькі адной форме мастацтва — мастацтву шукаць еўрапейскіх спонсараў за кошт стварэння нейкіх культурных штучак.

Але, здаецца, асаблівай бездані паміж народам і культурнымі дзеячамі няма. Гэта пацвердзіла закрыццё мерапрыемства. У апошні дзень кангрэсу ў Вроцлаве праходзіў бой паміж украінцам Віктарам Клічко і палякам Тамашом Адамчыкам. Ажыятаж вакол падзеі быў фантастычны. Каб набіць кішэні, арганізатары пайшлі на незвычайны крок — эксклюзіўныя правы на трансляцыю прадалі адной прыватнай нямецкай кампаніі. Ніякай трансляцыі па тэлебачанні. Аматарам накдаўнаў, апперкотаў і хукаў давялося прыехаць у Вроцлаў і купіць білет на трыбуны стадыёну. Такіх дзівакоў (што можна пабачыць з трыбуны стадыёну!?) знайшлося каля 50 тысяч асобаў.

Яны запоўнілі цэнтр горада, дзе ўжо тусаваліся артысты з кангрэсу. Тыя нечакана адчынілі для сябе свет боксу, і аказалася, што яны таксама не супраць пабалець за Адамчыка ў кампаніі з простымі людзьмі. На рынгу польскаму баксёру Клічко смачна настукаў па твары аж да гематомы пад вокам. У 10-м раўндзе суддзя быў вымушаны спыніць масакру. На гэтай высокай ноце адзінства інтэлігенцыі і народа, што праявілася ў форме спагады да збітага Тамаша Адамчыка, бой і Кангрэс культуры закончыліся.

ГАДАВІНА

# КАЗАК СУПРАЦЬ КАЗАХА

Алег НОВІКАЎ

**20 гадоў таму ва Уральску адбыліся сутычкі паміж казахамі і казакамі. Ёсць версія, што ў выпадку з'яўлення ахвяр на захад Казахстана павінны былі быць кінуты расійскія «міратворчыя войскі» для стварэння тут мясцовага варыянту Прыднястроўя.**

Хаця словы «казак» і «казах» яўна этымалагічна блізкія, вялікіх узаемных сімпатый паміж прадстаўнікамі гэтых народаў гістарычна не было.

Казакі, і перш за ўсё ўральскія, з часоў царызму ўвайшлі ў гісторыю Казахстана як авангард каланізацыі, былі аналагам цяперашняга спецназу. Не менш ненавідзелі ўральцаў бальшавікі. Нягледзячы на тое, што паўстанне Емяльяна Пугачова займала важнае месца ў гісторыі сацыяльных пратэстаў Расіі, Сталін не легалізаваў мясцовае казацтва, у адрозненні ад данскога і кубанскага (ім дазволілі ствараць напярэдадні вайны свае фармаванні і падтрымліваць культурныя традыцыі). У дадатак Уральск — сталіцу ўральскага казацтва — у 1920 годзе перадалі ў склад Казахстану. Сам Уральск з часам ператварыўся ў тыповы абласны правінцыйны горад. На момант канфлікту ў ім жылі каля 250 тысяч чалавек, з іх 150 тысяч — рускія.

У пачатку 1990-х гадоў па ўсім Савецкім Саюзе з'явіліся мужчыны ў дзіўных ваенных мундзірах рознага стылю, рознага фасону, з немаведама адкуль узятымі медалямі, з пагонамі, лампасамі, ды яшчэ з шашкамі і нават бізунамі. Яны называлі сябе казакамі. Так была вельмі хутка адноўлена сувязь казацкіх пакаленняў. З'явілася мода на казакоў і ва Уральску. Гэта была трэцяя па ліку адноўленая абшчына казакоў у Савецкім Саюзе.

Хаця па статуту абшчына збіралася займацца выключна культурай і гісторыяй, яна хутка зацікавілася палітыкай. У паветры луналі геапалітычныя праекты пра перадзел тэрыторыі Казахстана. Вялікі рэзананс атрымаў знакаміты артыкул Аляксандра Салжаніцына, які выступаў за далучэнне да Расіі Паўночнага Казахстану. Ужо ў жніўні 1990 года казакамі была прынята рэзалюцыя з патрабаваннем вярнуць «землі Уральскага казацтва» ў склад Расіі. Казакоў падтрымлівала мясцовая адміністрацыя. Пасля таго, як у рэспубліцы пачалося асцярожнае пашырэнне сферы ўжывання казахскай мовы, гарсавет прыняў пастанову пра тое, што справаводства ў горадзе Уральску павінна весціся на рускай мове, руская мова абвяшчалася мясцовай афіцыйнай мовай. У лютым 1991 года ў Маскве была агучана ідэя стварыць Уральскую аўтаномную вобласць, куды б увайшлі землі Уральскай, Гур'еўскай абласцей Казахстана і аўтаномнай Калмыкіі (Расійская Федэрацыя).

Адначасова набіраў моц мясцовы нацыянальны казахскі рух. У тутэйшых казахаў таксама была і ёсць гісторыя. Тутэйшая інтэлігенцыя адносіць сябе да нашчадкаў лідараў Букееўскай арды (буфернае адміністратыўнае ўтварэнне на мяжы Расіі і Стэпу ў XIX стагоддзі). Свядомыя казахі тусаваліся пад дахам арганізацыі «Азат».

Супрацьстаянне «Азату» і казакоў дасягнула апагею ўвосень 1991 года. Чыннікам драматычнай канфрантацыі стала жаданне лідараў уральскіх казакоў шырока адзначаць 400-годдзе служэння ўральскіх казакоў расійскай кароне. Яно выпадала на 15-е верасня 1991 года. Фармальнай нагодай стала тое, што папярэдні юбілей, 300-годдзе служэння расійскай кароне, святкавалі тут у 1891 годзе.

Самога рускага самадзяржаўя ў 1991 годзе ўжо не было. Такім чынам, служыць (дакладней, даслужваць чацвёртую сотню гадоў) было няма каму, аднак, як кажуць, была б падстава. Гарадскія ўлады далі згоду на правядзенне свята, якому казакі адразу вырашылі надаць саюзны фармат — запрасілі калег з іншых казацкіх грамад яшчэ афіцыйна існуючага СССР. Самае смешнае, што дазвол быў дадзены на святкаванне не толькі юбілею далучэння ўральскага казацтва да Расіі. Казахам, каб яны не мелі комплексаў, прапанавалі святкаваць 15 верасня дзень нараджэння аднаго з лідараў казахскага сялянскага паўстання.

«Азат» не меў кадравага рэсурсу, каб сарваць 400-годдзе служэння расійскай кароне. Таму нацыяналісты адправілі ў Алма-Ату дэлегацыю, якая ўзняла ўсю казахскую грамадскасць. Усе на той час актыўныя нацыяналістычныя арганізацыі заклікалі свядомых казахаў ехаць 15 верасня ва Уральск. Назва кааліцыі па зрыву казацкага юбілею гучала вельмі арыгінальна — «Аттанайык Жайыкка», што можна перакласці даслоўна як «Па конях, наперад, на Яік» (Яік — гістарычная назва Уралу).

Такім чынам, напярэдадні дня Х вакол Уральска назіралася заўважная мітусня. З розных куткоў Расіі, пачынаючы з Далёкага Усходу, ва Уральск ехалі сотні казакоў у парадных мундзірах. І з розных куткоў Казахстана ва Уральск ехалі сотні актывістаў казахскіх нацыянальных арганізацый — на цягніках, на машынах, і нават на конях.

Першымі ініцыятыву захапілі нацыяналісты. Яны акупавалі цэнтральную плошчу і тры дні без перарыву мітынгавалі. Пасля казахскі дэсант паспрабаваў не дапусціць праходу казакоў з вакзалу на малебен. Кульмінацыяй супрацьстаяння стала блакада ДК заводу «Зеніт», дзе праходзіў святочны сход з нагоды юбілею. Аматары сесці на коней і паехаць на Яік баяліся, што ўдзельнікі могуць абвесціць аўтаномію Уральскага краю. Натоўп казахаў акружыў будынак і намагаўся прарвацца ў залу. Як пішуць сучаснікі, сітуацыя была вельмі напружанай. Тым больш, што маглі мець месца правакацыі.

Былы кіраўнік Уральскай вобласці пасля казаў, што казакамі дырыжывалі з Масквы, што ў той дзень на мяжы Казахстана стаялі з заведзенымі маторамі танкі генерала Альберта Макашова. Меркавалася па прыднястроўскім сцэнары адсекчы заходнюю нафтагазаносную частку Казахстана і падняць сцяг «Прыўральскай рэспублікі». Патрэбна была толькі нагода — жудасная навіна пра тое, што ва Уральску забіваюць рускіх.

Аднак у апошні момант эмоцыі ўдалося стрымаць. Зрабіла гэта адна з казахскіх жанчын, якая зняла з галавы белую хустку і кінула яе перад калонай раз'юшаных нацыяналістаў. Па казахскіх рытуалах пераступіць яе нельга. Натоўп спыніўся і паступова разышоўся.

Падзеі ва Уральску былі напоўніцу выкарыстаны тагачасным казахскім лідарам Назарбаевым. Ён выкарыстаў Уральск як жывы прыклад таго, што чакае рэспубліку ў выпадку палітычнай нестабільнасці. Амаль усе групы грамадства пагадзіліся на ўзмацненне яго персанальнай улады, якая была гарантам парадку.

Аднак формула «персанальны аўтарытарызм у абмен на стабільнасць», відавочна, не вырашае праблему ў комплексе. У статуце казацкай грамады Уральску чорным па белым напісана, што мэта арганізацыі — уз'яднанне з Арэнбургскім казацтвам, якое знаходзіцца ў Расіі. На сайтах казахскіх нацыяналістаў хапае шавіністычных заклікаў.

Ці захопяць падобныя настроі ў бліжэйшы час масы, будзе залежаць ад таго, як Назарбаеў праўдзе аперацыю «пераемнік». Праўда, не факт, што ён увогуле збіраецца яе праводзіць. Прынамсі мясцовая Акадэмія навук актыўна працуе над прэзідэнцкім загадам: як мага хутчэй сінтэзаваць эліксір вечнага жыцця.

> У апошні момант эмоцыі ўдалося стрымаць. Зрабіла гэта адна з казахскіх жанчын, якая зняла з галавы белую хустку і кінула яе перад калонай раз'юшаных нацыяналістаў. Па казахскіх рытуалах пераступіць яе нельга

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МЭЛС ЕЛЕЎСІЗАЎ



Старшыня казахскага экалагічнага руху Табігат, экс-кандыдат у прэзідэнты на выбарах 2011 года, вядомы і як адзін з самых праўладных «апазіцыянераў» у краіне. На згаданых выбарах у студзені ён нават публічна заявіў, што, як свядомы апазіцыянер, будзе галасаваць за Назарбаева. Аднак такая лаяльнасць не замінае яму выступаць з фантастычнымі праектамі. Так, на мінулым тыдні падчас сустрэчы з Нурсултанам Назарбаевым ён прапанаваў прэзідэнту адміністратыўную рэформу, у аснову якой можа быць пакладзены прынцып водных басейнаў. Усяго, на думку Мэлса, у краіне павінны існаваць не вобласці, а восем водна-басейнавых аймакаў (так ён называе гэтыя адміністратыўныя адзінкі). Сваю прапанову Мэлс Елеўсізаў абгрунтоўвае тым, што на планеце ідзе працэс пацяплення, у выніку чаго інтэнсіўна растаюць ледавікі, і ў перспектыве ў дзяржаве можа паўстаць дэфіцыт прэснай вады. Эколаг кажа, што «сёння трэба кансалідаваць рэсурсы рэгіянальных і рэспубліканскіх органаў па падтрыманню водных рэсурсаў на неабходным узроўні, для чаго і патрэбная адміністратыўная рэформа». Паводле слоў Мэлса, прэзідэнт Нурсултан Назарбаеў, які даў яму аўдыенцыю, «уважліва выслухаў» яго праект рэформы. Незалежная прэса пішa, што ўвесь сыр-бор з аймакамі завязаны з новымі чуткамі пра кепскае здароўя прэзідэнта. Елеўсізаў, які сустрэўся з Назарбаевым, павінен засведчыць публіцы, што гарант абсалютна здаровы. Сапраўды, вялікі блок яго прэс-канферэнцыі пра пагрозы глабальнага пацяплення быў прысвечаны менавіта таму, як добра выглядае Назарбаеў.

### УРСУЛА ФОН ДЭР ЛАЙЕН



Маці сямі дзяцей, міністра працы ў нямецкім урадзе, пачалі называць найбольш патэнцыйным пераемнікам Ангелы Меркель пасля таго, як два тыдні таму Хрысціянска-дэмакратычны саюз (CDU) пад кіраўніцтвам канцлера прайграў чарговыя зямельныя выбары. Усё таму, што яна найбольш папулярная на фоне іншых міністраў. Самае цікавае, што рэйтынг фон дэр Лайен застаецца дастаткова высокім на фоне яе эксцэнтрычных заяў. Апошняя з іх тычыцца ідэй павышэння сацыяльных пасобій і ператварэння ЕС у Аб'яднаныя Штаты Еўропы. Прычым міністр адкрытым тэкстам кажа, што Германія ў гэтым фармаванні будзе звычайным штатам, роўным з іншымі. Любому палітыку, ды яшчэ з правага лагеру, такія выразы каштавалі б вельмі шмат, аднак фон дэр Лайен усё прабачаюць. Феномен Урсулы дастаткова цікавы і, магчыма, звязаны з вобразам клапатлівай маці. Праўда, атрымаць пасаду новага старшыні CDU ёй будзе няпроста. Хаця б таму, што Ангела Меркель таксама думае, каму перадаць паўнамоцтвы. Прэса лічыць, што ў якасці пераемніка яна будзе лабіраваць Крысціну Шродэр — цяперашняга міністра па справах сям'і.

### ОМБІР УПАДХАУ

Нарвежскі грамадзянін індускага паходжання стаў адной з зорак выбарчай кампаніі ў мясцовыя органы ўлады, што прайшла ў Нарвегіі 11 верасня. Так здарылася, што Упадхау з'яўляецца сябрам правай радыкальнай Партыі прагрэсу (FrP). Як гэтага чалавека з цёмнай скурай занесла ў шэрагі FrP, што выступае за правы белай расы, цяжка сказаць, аднак менавіта ён стаў візітоўкай партыі. Справа ў тым, што выбары адбываліся праз 2 месяцы пасля гучнай выхадкі тэрарыста Андэрса Брэйвіка, які забіў 77 чалавек. З-за таго, што Брэйвік быў сябрам FrP, нарвежскае грамадства ахапіла фобія на адрас праварадыкалаў. Місія Упадхау палягала на тым, каб давесці публіцы, што Партыя прагрэсу—нармальная арганізацыя, а не сход фашыстаў і расістаў. Для гэтага індуса піярылі як толькі можна. Аднак гэта не надта дапамагло: Партыя прагрэсу набрала толькі 5,5 працэнта (у 2007-м за іх галасавала 13 працэнтаў). Затое сацыял-дэмакраты, чый моладзевы лагер расстраляў Брэйвік, сабралі салідны ўраджай галасоў — 33 працэнта. Павялічылі сваю прысутнасць у мясцовых саветах і кансерватары, да якіх перайшлі сімпатыі былых фанатаў FrP. Кіраўніцтву Партыі прагрэсу застаецца супакоіць сябе тым, што выбары былі спецыфічныя і, па-сутнасці, мелі характар рэферэндуму па пытанню стаўлення да ўчынку Андэрса Брэйвіка.



ЦІКАВА

# АРТЫМОВІЧЫ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Хачу расказаць пра знакамітых беларусаў з Беласточчыны Віктара, Адама і Антона Артымовічаў, якія ў XIX стагоддзі ўнеслі вялікі ўклад у эканамічнае развіццё Расійскай імперыі. На жаль, што не сваёй уласнай Бацькаўшчыны, а менавіта Расійскай імперыі. І гэта не іх віна, а бяда. Бо, як мы ведаем з гісторыі, беларускае гаспадарства было ліквідавана ў канцы XVIII стагоддзя. Да гэтага спрычыніліся нашы як заходнія, гэтак і ўсходнія суседзі.**



Віктар Артымовіч



Адам Антонавіч Артымовіч

Увесну 1791 года ў часе Вальнага Сойму польскія магнаты і апалячаная беларуская шляхта, імкнучыся ўмацаваць Польшчу, над якой навісла пагроза з боку Аўстрыі, Прусіі і Расіі, заявілі пра неабходнасць увядзення спадчыннай манархіі і зліквідавання адметных дзяржаўных структураў Вялікага Княства. Так здзейснілася мара нашых заходніх суседзяў. Беларускае гаспадарства з гэтага моманту дэюрэ ўвайшло ў склад Польшчы. Праўда, ненадоўга. У маі 1792 года расійская армія пад камандаваннем Крачэтнікава захапіла Вільню і ўсталявала кантроль над нашымі землямі. А ў 1793 годзе Расійская імперыя анексавала цэнтральную частку Беларусі (усходнія землі былі захопленыя яшчэ раней — у 1772 годзе).

У 1795 годзе, калі Расія дарэшты захапіла Беларусь, распараджэннем Кацярыны ІІ нашы землі ўвайшлі ў тры створаныя тады адміністрацыйныя адзінкі — генерал-губернатарствы: Беларускае (Полацкая і Магілёўская губерні), Літоўскае (Слонімская і Віленская губерні ды дзве вобласці — Ковенская і Гарадзенская) і Падольскае (Менская, Валынская і Падольская губерні).

Такім чынам, аніякага «ўз'яднання» Беларусі з Расіяй, як гэта доўга тэндэнцыйна сцвярджалася ў савецкай гістарычнай літаратуры, ніколі не было. Меў месца гвалтоўны захоп, у выніку якога тэрыторыя Беларусі разам з беларускім народам была далучана да Расіі, і наш пакутны народ на дзвесце гадоў трапіў у маскоўскую нядолю.

Такі лёс быў і вельмі адукаваных, разумных і таленавітых беларусаў Віктара, Адама і Антона Артымовічаў. У Расійскай імперыі ў іх нават нацыянальнасць пісалася не беларуская, а польская альбо расійская.

Віктар Антонавіч Артымовіч нарадзіўся ў Беластоку ў 1820 годзе. Пра яго маленства і школьныя гады мала што вядома. Але мы ведаем, што бацька Віктара Антон Фёдаравіч Артымовіч (прафесар матэматыкі і астраноміі Віленскага ўніверсітэта) за вельмі кароткі час зрабіў добрую чыноўніцкую кар'еру, атрымаў 2000 дзесяцін зямлі і фальварак. Ён быў на той час даволі багатым чалавекам. Таму меў грошы, каб даць сыну добрую адукацыю. І сын хутка скончыў Імператарскае вучылішча правазнаўства ў Пецярбурзе. А гэта вучылішча на той час рыхтавала дзяржаўных служачых, чыноўнікаў вялікага рангу.

З 1842 да 1853 гадоў Віктар Артымовіч служыў у Сенаце — адным з вышэйшых дзяржаўных органаў Расійскай імперыі, галоўнай функцыяй якога ў той час было «блюсти законы», змагацца са злоўжываннем як у цэнтры, так і ў губернях. З гэтай мэтай Сенат адпраўляў туды сенацкія рэвізіі, у якіх малады Артымовіч рэгулярна прымаў удзел, дасканала вывучаючы дзейнасць чыноўнікаў. Ужо тады Віктар Артымовіч стварыў сабе рэпутацыю вельмі прынцыповага і сумленнага рэвізора, які наводзіў страх на ўсіх хабарнікаў і казнакрадаў. У Сенаце ён даслужыўся да ўпраўляючага справамі.

У 1854 годзе Віктар Артымовіч быў прызначаны табольскім губернатарам. За пяць гадоў службы ў Табольску ён не толькі зарэкамендаваў сябе надзвычай дзейным кіраўніком губерні, але актыўна вёў барацьбу з хабарніцтвам, навёў парадак у службовых месцах, палепшыў становішча ссыльных. Дарэчы, пасля паўстання 1831 года, а таксама пасля таго, як у 1846 годзе 1100 сем'яў аднадворцаў па загаду міністра ўнутраных спраў Расіі гвалтам былі перасяленыя з Беларусі на Каўказ і ў многія губерні Расіі, а таксама пасля паўстання 1863 года, ссыльных землякоў Віктара Артымовіча было ў Табольскай губерні шмат. Губернатар іх не крыўдзіў. Знаходзіў жыллё, працу, дапамагаў. Гэтым учынкам хутка зацікавіліся прадстаўнікі расійскага ўраду, і нашага земляка перавялі губернатарам у Калужскую губерню. Але і там ён дапамагаў ссыльным з заходніх рэгіёнаў тагачаснай Расійскай імперыі. За працай і ўчынкамі Віктара Артымовіча вельмі сачылі. А калі колькасць ссыльных пасля 1863 года стала ў губернях Расіі павялічвацца, Віктара Артымовіча перавялі на працу ў Варшаву. Тым не менш, там ён доўга не затрымаўся, бо па ўласнай заяве яго зноў перавялі ў Сенат, дзе Віктар Антонавіч пачынаў і дзе адпрацаваў усе астатнія гады свайго жыцця.

Нашага земляка ўсе вельмі паважалі. Ён меў роўны, спакойны характар і дужа паважліва ставіўся да сваіх падначаленых. Нездарма, прызначаючы 34-гадовага Артымовіча губернатарам Табольска, цар Мікалай І, які ўсім «тыцкаў», звяртаўся да яго выключна толькі на «вы».

У 1854 годзе, незадоўга да свайго прызначэння ў Табольскую губерню, Віктар Артымовіч ажаніўся з Ганнай Жамчужнікавай. З дружнай і таленавітай сям'ёй Артымовіч пасябраваў адразу, калі прыехаў з Беластока ў Пецярбург. З братам жонкі Аляксеем ён вучыўся ў адным класе вучылішча правазнаўства. Вельмі любіў бываць у доме Жамчужнікавых. Два браты Жамчужнікавых былі паэты, адзін — мастак, іх стрыечны брат — рускі пісьменнік Аляксей Талстой. А бацька Ганны Жамчужнікавай быў сенатарам. Шлюб Віктара Артымовіча і Ганны Жамчужнікавай быў вельмі шчаслівым. Ганна перажыла мужа, але апошнія гады свайго жыцця яна збірала матэрыялы пра яго жыццё і дзейнасць. Віктара Антонавіча Артымовіча не стала ў 1893 годзе.

Выпіска з метрыкаў, пасведчанне аб заканчэнні вучылішча правазнаўства, дыплом на званне сапраўднага члена Рускага геаграфічнага таварыства, біяграфія, некралог, розныя загады, пісьмы, перапіска, радаслоўная Артымовічаў, матэрыялы сям'і Жамчужнікавых і шмат іншых матэрыялаў захоўваюцца сёння ў Інстытуце рускай літаратуры Расійскай Акадэміі Навук (ф.11, адзін. зах. 82).

Родны брат Віктара Артымовіча Адам Артымовіч быў маладзейшы за брата на 8 гадоў. Ён нарадзіўся ў Беластоку ў 1828 годзе. Скончыў Беластоцкую гімназію, а ў 1849 годзе — Пецярбургскае Імператарскае вучылішча правазнаўства. Дзякуючы вучобе ў гэтым вучылішчы Адам Антонавіч атрымаў даволі высокі чын тытульнага дарадчыка і пачаў службу летам 1849 года ў Першым Дэпартаменце Урадавага Сената Расіі.

З 1857 года Адам Артымовіч пачаў працаваць чыноўнікам пры Арэнбургскім і Самарскім генерал-губернатары. Потым загадваў канцылярыяй губернатарства. На гэтай пасадзе ён зарэкамендаваў сябе вельмі



Антон Артымовіч

добра ў адносінах падрыхтоўкі вызвалення сялян ад прыгоннага права. Прымаў таксама ўдзел у рэвізіях Заходняй Сібіры. А пасля гэтага Адам Артымовіч стаў працаваць чыноўнікам па важных даручэннях пры Арэнбургскім і Самарскім генерал-губернатары.

1 студзеня 1861 года наш зямляк быў прызначаны кіраўніком Самарскай губерні Расіі. Як губернатар ён удзельнічаў у рабоце па вызваленні сялян Самарскай губерні ад прыгоннага права па Маніфесту 19 лютага 1861 года. Гэту работу ён выканаў з гонарам, не парушаючы інтарэсаў ні сялян, ні памешчыкаў.

Пры Адаму Артымовічу пачалося фарміраванне ў заволжскіх стэпах Самарскай губерні раёна таварнага земляробства, якое дазволіла забяспечыць рост самой Самары — з 1861 да 1897 гадоў колькасць самарскіх жыхароў павялічылася на 226%, сярод якіх шмат было беларусаў з Паўночна-заходняга краю Расіі. Дзякуючы Адаму Антонавічу ў Самары былі адкрыты тэлеграфная кантора і гарадскі агульны банк.

У 1861 годзе па загаду Адама Артымовіча там быў пабудаваны новы Кафедральны праваслаўны сабор імя Прасвятой Багародзіцы. Губернатар шчыра заахвочваў будаўніцтва ў горадзе праваслаўных храмаў і каменных пабудоў…

17 красавіка 1862 года Адама Артымовіча перавялі на пасаду апекуна Адэскай вучэбнай акругі. Прычынай такога паніжэння ў пасадзе стала тое, што наш зямляк выступаў за аддзяленне Самарскай губерні ад генерал-губернатарства. А таксама тое, што ён разам з братам Віктарам (калужскім губернатарам) падтрымліваў цесныя сувязі з рэвалюцыйнымі польскімі гурткамі. Адам і Віктар Артымовічы дапамагалі фінансамі будучым паўстанцам на Беларусі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага…

2 мая 1962 года Адам Антонавіч наладзіў развітальны абед і разам з жонкай паехаў на новае месца службы ў Адэсу. Пры пераводзе на новае месца працы яго нават узнагародзілі ордэнам Святога Уладзіміра трэцяй ступені, а праз тры гады — ордэнам Святога Станіслава першай ступені.

У Адэсе наш зямляк працаваў амаль да смерці. Яго не стала 15 студзеня 1893 года.

Антон Артымовіч (1832–1910) быў самым малодшым братам Артымовічаў. Але пра яго звесткак пакуль сабраць удалося мала. Ды і не такім вядомым ён быў у Расіі, як Віктар і Адам. Антон нарадзіўся ў Беластоку ў 1832 годзе. Быў правадзейным тайным работнікам, потым сенатарам. Яго жонкай стала Вольга Рымская-Корсакава, чые продкі былі беларусамі і паходзілі з Літвы. У іх нарадзілася шасцёра дзяцей. Сярод якіх — Марыя была «класной дамой» у Ніжагародскім Марынінскім інстытуце шляхетных дзяўчат. Сын Уладзімір служыў у Міністэрстве замежных спраў Расіі. А з 1910 года быў дырэктарам Дэпартаменту асабістага складу і гаспадарчых спраў. Яго жонкай была амерыканка Марыяна Гобс…

Каб расказаць пра ўсіх Артымовічаў — беларусаў з Беласточчыны, пра іх дзяцей, унукаў, праўнукаў і прапраўнукаў — неабходна напісаць некалькі тамоў кніг. Тым не менш, яны ведаюць і павінны ведаць, хто іх быў далёкі продак з Беластока праваслаўны беларус (ліцвін) Артымовіч Антон Фёдаравіч, яго сыны Віктар, Адам і Антон Артымовічы. Лёс беларусаў Артымовічаў раскінуў па ўсім свеце. Яны сёння жывуць не толькі ў Расіі, але і ў Польшчы, Беларусі, ЗША, Іране, Францыі, Англіі і ў іншых краінах свету. Магчыма, з гэтага роду і слынная наша беларуская паэтка з Беласточчыны Надзея Артымовіч, якая неяк напісала: «І нават тады, калі пацямнее дарога, а вецер і дождж вырасце сцяной, мы будзем ісці да чыстай вады, да ніў залатых і да нашага блакітнага неба».

СПАДЧЫНА

# ЛАЎРЫШАЎСКІ МАНАСТЫР

Лявон ЦЕЛЕШ

**Пісьменства і кнігадрукаванне зарадзілася на Беларусі ў сівой даўніне. Самым старажытным помнікам пісьменства не толькі ў нашай краіне, але і на ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы лічыцца надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава. Старажытнае пісьменства прадстаўлена таксама надпісамі на Барысавых і Рагвалодавых камянях, берасцянымі граматамі, на крыжы Ефрасінні Полацкай.**



Вокладка Лаўрышаўскага Евангелля



Фота аўтара

Помнік Елісею Лаўрышаўскаму



Свята-Елісееўская царква

## Летапісны цэнтр

Ужо ў пачатку XI стагоддзя на тэрыторыі сённяшняй Беларусі пачалася перапіска кніг. Вялася яна ў майстэрнях-скрыпторыях, якія ствараліся пры манастырах. На жаль, шматвяковая трагічная гісторыя Беларусі, землі якой увесь час былі ў эпіцэнтры ваенных падзей, адбілася і на лёсе гэтых старажытных культурных і духоўных цэнтраў. Многія манастыры і храмы былі знішчаныя, а вялікія каштоўнасці, такія, як крыж Ефрасінні Полацкай, старажытныя рукапісы і кнігі, апынуліся ва ўсходніх ці заходніх суседзяў.

Зусім нядаўна мне пашчасціла пабываць на апетай Адамам Міцкевічам зямлі Навагрудчыны і наведаць адзін са старажытнейшых на Беларусі Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр, азнаёміцца з археалагічнымі раскопкамі, якія праводзіць археолаг, доктар гістарычных навук, прафесар Сяргей Расадзін сумесна з валанцёрамі — студэнтамі Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Адбылося маё знаёмства з манастыром, з ігуменам манастыра, іераманахам айцом Яўсевіем, а ад летапісца Лаўрышаўскага манастыра, манаха Феадосія я даведаўся гісторыю манастыра.

Звесткі аб Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім мужчынскім манастыры сустракаюцца ў летапісах Вялікага Княства Літоўскага, «Хроніцы» Стрыйкоўскага, гістарычных працах праваслаўных, уніяцкіх і каталіцкіх дзеячаў XVII–XVIII стагоддзяў. Іпацьеўскі летапіс паведамляе пад 1262 годам, што заснаваў манастыр на беразе Нёмана сын Літоўскага князя Трайняты, пляменніка Міндоўга, прападобны Елісей Лаўрышаўскі каля 1225 года. У тыя часы гэта была самая крайняя праваслаўная кропка, што глыбока ўдавалася ў заходнюю паганскую тэрыторыю. Паступова гэты асяродак культавага жыцця стаў адным з буйнейшых на Беларусі і атрымаў назву Лаўра. Гэта адзіная вядомая на сёння Лаўра ў гісторыі Беларусі.

Пра жыццё прападобнага Елісея сведчанняў дайшло да нашага часу няшмат, бо шматлікія войны, якія вогненнай віхурай пранесліся па гэтай зямлі, знішчылі ўсе сляды яго біяграфіі. Вядома толькі, што Елісей Лаўрышаўскі ў 1250 годзе быў забіты сваім звар'яцелым паслушнікам, і яго святыя мошчы з цягам часу пачалі славіцца шматлікімі цудатварэннямі.

У XIII–XIV стагоддзях манастыр быў летапісным цэнтрам нашай старадаўняй краіны. У 1329 годзе ў манастыры было створана рукапіснае Лаўрышаўскае Евангелле — помнік беларускага кнігапісання, якое зараз знаходзіцца ў Кракаве, у прыватнай бібліятэцы-музеі Чартарыйскіх. Напісана яно было на пергаменце царкоўна-славянскай мовай. Евангелле каляровае — тэкст напісаны каляровымі фарбамі і змяшчае ілюстрацыі ў грэчаскім, візантыйскім.

У XVI стагоддзі пачасціліся напады на тэрыторыю Навагрудчыны крымскіх татар. Спустошыўшы ў 1508 годзе наваколлі Навагрудка, яны, ведаючы аб багацціях манастыра, наблізіліся да Лаўры. Як сведчыць паданне, татарам здалося, што ў манастырскім двары стаіць вялікая конная сіла, і яны адступілі. Падзея гэтая стала нагодай для кананізацыі прападобнага Елісея на Віленскім саборы ў 1514 годзе.

На гэты ж перыяд прыпадае і незвычайны росквіт манастыра: тут пачала дзейнічаць школа, мелася багатая бібліятэка і друкарскія майстэрні. Мірнае жыццё прыпыніў паўторны набег татар, у выніку чаго ўсе манахі былі забітыя, а каменны манастыр быў зраўнаваны з зямлёй. Мошчы прападобнага Елісея і маёмасць манастыра былі схаваныя ў зямлю і дагэтуль не знойдзеныя.

Першае адраджэнне манастыра адбылося ў другой палове XVI стагоддзя ў межах вёскі Лаўрышава. На пачатку XVII стагоддзя манастыр перайшоў да ўніятаў, якія стварылі тут семінарыю, з 1615 года тут дзейнічаў базыльянскі манастыр. Новыя пабудовы ў межах ужо праваслаўнага манастыра з'явіліся ў канцы XVIII стагоддзя. Былі пабудаваны побач з манастыром драўляная Свята-Успенская царква, якая дзейнічае і зараз, брацкі корпус, цагляныя будынкі архіва і склада, бібліятэка, якая налічвала 500 тамоў.

## Заняпад і адраджэнне

Але паступова манастыр прыйшоў у заняпад. У 1824 годзе ў Лаўрышаве налічвалася толькі пяць насельнікаў, а ў 1836 годзе манастыр зачынілі, храм стаў прыходскім. Сёння ад манастырскіх будынкаў, акрамя царквы, нічога не засталося. Менавіта, на гэтым месцы і праводзяцца зараз археалагічныя даследаванні пад кіраўніцтвам прафесара Сяргея Расадзіна.

На даследуемай пляцоўцы плошчай у 32 квадратных метра культурны слой мае магутнасць прыблізна 1 метр. Па колькасці знаходак першае месца займае кераміка: фрагменты непаліванага, дымленага і паліванага керамічнага посуду, сабрана шмат фрагментаў кафлі, некаторыя з якіх маюць геральдычную выяву, асколкі пляшак самаробнага вырабу з рознай таўшчынёй шкла. Усе знаходкі датуюцца XVI — пачаткам XIX стагоддзя. Знойдзена таксама некалькі манет царскай Расіі. Здабытыя падчас археалагічных раскопак матэрыялы пацвярджаюць факт знаходжання ў XVI–XIX стагоддзях на гэтым месцы, побач з царквой, манастыра.

Другое адраджэнне Лаўрышаўскага манастыра адносіцца да 1913 года. На першапачатковым месцы старажытнага манастыра намаганнямі князя Храптовіча-Буценёва была асвечана царква ў імя прападобнага Елісея, брацкі корпус і дом для паломнікаў. Аднак у часы Першай сусветнай вайны ўсе будынкі манастыра былі зруйнаваныя. Пападаннем нямецкага снарада царква была ўшчэнт разбурана. І толькі амаль праз 80 гадоў, у 1993 годзе, гэтае святое шматпакутнае месца было асвечана архіепіскапам Беластоцкім і Гданьскім Савам, епіскапам Навагрудскім і Лідскім Канстанцінам.

Пачалося трэцяе адраджэнне манастыра. На падмурках разбуранай царквы была ўзведзена новая цагляная Свята-Елісееўская царква, побач з якой быў устаноўлены помнік прападобнаму Елісею Лаўрышаўскаму. На месцы згарэўшага ў 2008 годзе брацкага драўлянага корпуса будуецца новы, капітальны будынак. Звесткі аб ім разыходзяцца ўсё шырэй. Павялічваецца паток паломнікаў, хросныя хады ўжо збіраюць больш за 300 чалавек.

Як паведаміў айцец Яўсевій, адраджэнне манастыра мае на ўвазе стварэнне цэлага комплексу для рэабілітацыі людзей, якія аказаліся ў складаных жыццёвых абставінах, — тыя, хто згубіў надзею ў жыцці і хоча выратавацца, хто вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, хто спрабуе пазбавіцца ад алкагольнай залежнасці. Пры манастыры будуць працаваць майстэрні. Сёння манастыр прапануе ўнікальную магчымасць актыўнага адпачынку, бо месцы ў наваколлі Лаўрышаўскага манастыра вельмі маляўнічыя: побач Нёман, сасновы лес.

Трэба спадзявацца, што ўсе высакародныя задумы здзейсняцца, і трэцяе адраджэнне ў гісторыі манастыра будзе апошнім і канчатковым.



Ігумен манастыра айцец Яўсевій і гісторык-археолаг Сяргей Расадзін



На археалагічных раскопках

ПАДРАБЯЗНАСЦІ



Фота аўтара

Дыскусія ў галерэі «Артатэка»

# ВЫДАВЕЦКІ СЕМІНАР

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

**Дзве краіны Вышаградскай групы наведала дэлегацыя беларускіх незалежных выдаўцоў.**

У галерэі «Артатэка» гарадской бібліятэкі Браціславы прайшла дыскусія на тэму «Выдавецкі бізнэс у Славакіі (невялікія выдавецтвы, іх роля і функцыянаванне на рынку; аўтарскія правы; маркетынг і распаўсюд)» з удзелам Attila Agoston (выдавецтва «Kalligram»), Albert Marencin («Marencin PT»), KK Bagala (literarniklub.sk). Наведалі ўдзельнікі семінара і буйныя выдавецтвы «Ikar» і «Slovart».

У чэшскім Брно праца працягвалася ў выдавецтве «Vetrne mlyny» і ў рэдакцыі часопіса «RozRazil».

У кангрэс-зале тэатра «Husa na provazku» быў арганізаваны круглы стол на тэму «Выдавецкая справа ў Беларусі».

Гаворку «Выдавецкі бізнэс у Брно» правёў Marek Seckar («выдавецтва «Host»), а міні-лекцыю «Чэшскі кніжны рынак, чытачы і электронныя публікацыі» прачытаў Pavel Rehorhk (выдавецтва «Vetrne mlyny»).

Пасля прагляду двух дакументальных фільмаў з цыклу «Беларусь ёсць паэзія» адбыўся абмен думкамі на тэму «Літаратура і кіно» (фільм і рэклама; эканамічны бок дзейнасці выдавецтва), а на заканчэнне былі рэпрэзентаваныя найбольш вядомыя сучасныя чэшскія аўтары і найбольш папулярныя кнігі.

КІНО

# КІНАПРЭМ’ЕРЫ ВЕРАСНЯ

Андрэй РАСІНСКІ

**Сёлетні верасень не вельмі багаты на значныя стужкі. Самая важная кінапрэм’ера — драма Педра Альмадовара «Скура, у якой я жыву». У гэтай карціне доктар, сыграны Антоніа Бандэрасам, палюе за нягоднікам, каб адпомсціць за пакуты дачкі. Фільм з’явіцца ў Мінску 22 верасня.**

Іншыя рэжысёры са сваім почыркам — Джым Шэрыдан і Ціль Швайгер — прадстаўляць камедыю і трылер. У фільме Джыма Шэрыдана «Дом мараў» сям’я набывае дом, дзе калісьці адбылося забойства. А «Спакушальнік» Ціля Швайгера распавядзе пра пісьменніка, які спрабуе аднавіць былое каханне. Хаця працы Швайгера не заўжды ўдалыя, ён трымае пэўную планку.

Камедыі і фільмы жахаў на восеньскім экране пераважаюць. Звяртаю ўвагу на фільм «Не бойся цемры», зняты Мексікай і Аўстраліяй. Рэжысёр Трой Нiксі яшчэ не заўважаны ў вялікім кіно, але фільм — паўтор удалай карціны 1973 года. Стужка спрадусаваная рэжысёрам Гільерма Дэль Тора: у мексіканскага казачніка добры густ на страшнае кіно. Прэм’ера адбылася 8 верасня.

Сярод яшчэ адных рымэйкаў — камедыйна-жахлівая, амерыкана-індыйская(!) «Ноч страху» з Колінам Фарэлам. А вось «Кунг-фу Трусік», запланаваны на канец месяца, — сапраўдная кітайская анімацыя. Такое рарытэтнае кіно ледзьве не ўпершыню прадстаўлена на беларускіх экранах.

8 верасня стартаваў фільм «Каламбіяна» — амерыкана-французскі баявік пра чарговую прыгажуню-забойцу. Фільм абвяшчаецца спадкаемцам «Леона» і «Нікіты»; прынамсі, рэкламны ролік не дурны.

Падрабязней чытайце пра новыя фільмы на працягу гэтага месяца.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# НОВАЕ ІМЯ Ў ЛІТАРАТУРЫ

Кацярына КОЛБ

**У галерэі «Ў» адбылася прэзэнтацыя дэбютнай кнігі Сяргея Егарэйчанкі «Лебедзі паміраюць разам».**

Яшчэ зусім нядаўна «Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам» была адзначана прэміяй імя Максіма Багдановіча, а ўжо выйшаў у свет і першы зборнік маладога празаіка. Кніга прысвечана тэме рэпрэсій у мінулым і ў сучаснасці, зусім не новай, але ў нашай краіне заўсёды актуальнай.



Аўтар зачытвае ўрывак з кнігі

Прэзентацыя, нягледзячы на выходны дзень, сабрала нямала людзей розных узростаў. Якія, дарэчы, ледзь умясціла гасцінная зала кнігарні. Мерапрыемства прайшло традыцыйна для такіх сустрэч: брутальны вядучы, добрыя словы і пажаданні, чытанне аўтарам сваіх твораў і аўтографсесія. Не зусім звычайным для невялікага памяшкання кнігарні стала выступленне гурта «Верасень», якое, аднак, выдатна ўпісалася ў фармат прэзэнтацыі. Панавала цёплая атмасфера, нават камерная, нягледзячы на вялікую колькасць гасцей.

Разышоўся амаль увесь тыраж кнігі, зразумела ж, з аўтографамі аўтара. А тое, што засталося, можна набыць у кнігарні «ЛогвінаЎ» і ацаніць талент новага беларускага пісьменніка.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСАЎ

**Рэдакцыя дайджэсту «Дзяды» і фірма «Віцень» праводзяць у канцы кастрычніка — пачатку лістапада бягучага года 2-ю навукова-практычную канферэнцыю па пытаннях этнагенезу беларусаў.**

Першая канферэнцыі адбылася 30 студзеня. Справаздача аб ёй і даклады ўдзельнікаў былі апублікаваныя ў 6-м нумары дайджэсту «Дзяды».

Другая канферэнцыя прысвечаная перыяду з XIII да канца XVI стагоддзя, г. зн. часам Вялікага Княства Літоўскага. Галоўныя пытанні для абмеркавання:

— Хто, калі і як ствараў ВКЛ?

— Хто такія ліцвіны і русіны ў ВКЛ?

— Ці мелі жамойты дачыненне да стварэння ВКЛ?

— На якой мове гаварылі нашы продкі ў ВКЛ?

Канферэнцыя разлічаная на адзін дзень (нядзеля). Дакладная дата будзе паведамленая кожнаму з удзельнікаў. Удзел у канферэнцыі — за ўласны рахунак. Даклады будуць апублікаваныя ў «Дзядах» або ў асобным зборніку.

Запрашаем да ўдзелу навукоўцаў і зацікаўленых асоб. Тэзы дакладаў на беларускай або рускай мове (3–4 старонкі) трэба паслаць да 15 кастрычніка на адрас:

г. Мінск–131, абаненцкая скрыня 137, Тарасу А.Е.

Або электронны варыянт на адрас: aetaras@tut.by

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# ЯНЫ ВАС ЧАКАЮЦЬ!

## Барыкела — кот з годнасцю, арыстакратычны, вельмі акуратны



Па прызнанні валанцёраў — гэта самы ласкавы і кантактны коцік у свеце! Абдымаецца, як чалавек, дзвюма лапкамі за шыю і прыціскаецца сваёй пыскай да шчакі чалавека, і нават ежа яго ў такія хвіліны не хвалюе!

Коцік Барыкела зараз жыве ў прытулку «СуперКот», куды яго забралі валанцёры з пункту часовага ўтрымання на Гурскага. Яму 2 гады, кастраваны, прызвычаены да латку, агледжаны ветэрынарам.

Барыкела гатовы стаць вам самым лепшым сябрам і сагрэць цяплом свайго сардэчка.

Звaніце!

+37529 129-20-73 Марыя

+37529 199-99-15 Юлія

+37529 872-80-32 Алена

## Філя — сабака з душой паэта, філасофскімі поглядам на жыццё

Знешне Філя падобны на героя мульціка пра канікулы ў Прастаквашына. Хоць хлопец ён рослы, але прызвычаены да жыцця ў кватэры. Цудоўна ладзіць з іншымі сабакамі і катамі. Філя вельмі добры, далікатны і абаяльны. Любы растае ад ягонага разумнага погляду!

Філю каля годзіка, ростам прыкладна 45 сантыметраў у холцы. Ён зараз знаходзіцца пад апекай валанцёра прытулку «СуперКот», але вельмі жадае знайсці свой дом і самых любімых у свеце гаспадароў.



Звaніце!

+37529-3138372 Ірэна

Болей котак і сабак — у каталозе прытулку «СуперКот», www.forum.superkot.com

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81. novychas@gmail.com; www.novychas.org

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП "Плутас-Маркет". г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 970

Падпісана да друку 16.09.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.